Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

№ 80 (3188) Серада, 10 Красавіка 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII

Урэшчаная бібліятэка імя Горкага
Ин.2645

РАДЫЁ ў гадзіну ночы:

МАСКВА, 9. Член дэлегацыі СССР на жэнэўскай падрыхтоўчай камісіі па разбраеньні, тав. А. В. Луначарскі, выяжджае ў Жэнэву 10-га красавіка

Апошнія навіны **Б. С. С. Р.**

У бягучым будаўнічым сэзоне пачнецца пабудова дому ўраду

Наркамюст прапануе прыцягваць парушыцеляў працоўнай дысцыпліны да крымінальнай адказнасьці

Заняпад працдысцыпліны на транспарце

Сёньня адкрываецца пленум ЦК КП(б)Б у 12 гадз. дня ў залі пасяджэньняў ЦК

ПАРАДАК ДНЯ:

1) Аб веснавой пасеўнай кампаніі—дакл. т. т. Масюкоў, Калнін.

2) Аб прадукцыйнасьці працы і працоўнай дысцыпліне—дакл. т. т. Карп і Розін.

3) Аб ходзе загатовак—дакл. т. Аксючыц.

4) Аб землякарыстаньні і земляўпарадкаваньні—дакл. т. Галадзед.

5) Аб пляне работы ЦК КП(б)Б—т. Васілевіч.

6) Выбары дэлегатаў на XVI-ую канфэрэнцыю УсеКП(б).

Сакратар ЦК КП(б)Б ГАМАРНІК.

Вітаньне гаспадару сталіцы Савецкай Беларусі

Сёньня склікаецца першы пленум нанававыбранага Менскага гарадзкога савету.

Тая вялізная актыўнасьць мас, якою характарызавалася як справаздачная, так і перавыбарчая кампанія, ужо адзначае склад і кірунак работы панававыбранага сталічнага савету.

З 440 дэпутатаў, выбраных у савет, 390 выбраны ўпяршыню.

Гэты факт гаворыць сам за сябе.

Мы абнаўляем кіруючыя органы пралетарскай дыктатуры, уцягваючы ў іх новыя сотні і тысячы рабочых, прывучаючы іх да справы кіраваньня краінай.

Абвостраная клясавая барацьба ў краіне, цяжкасьці, што стаяць перад намі, якія мы можам і павінны перамагчы—усё гэта настойліва дыктуе неабходнасьць уцягненьня самых шырокіх мас працоўных да ўдзелу ў кіраваньні дзяржавай, да вырашэньня ўсіх тых задач, якія ставіць наша партыя.

Толькі па аснове масавасьці, толькі на аснове сапраўднага ўдзелу мас у штодзённай рабоце пралетарскае дзяржавы, мы можам рухацца наперад да новых посьпехаў у сацыялістычным будаўніцтве.

З гэтага пункту погляду мы можам сьмела гапарыцца як самымі выбарамі, так і складам новага Менскага гарсавету.

Перавыбарчыя сходы, асабліва на прадпрыемствах, характарызаваліся амаль стопроцантнай яўкай на іх выбаршчыкаў.

Паміма ўсебаковага і ўдумлівага абгаварэньня наказу, у якім прынялі ўдзел літаральна тысячы рабочых,—было ўнесена 2.873 дадаткаў да яго, у большай частцы дзелавых, практычных.

У самым складзе новага савету мы маем 174 дэпутатаў-рабочых, якія непасрэдна працуюць ля варштату, перадавікоў-актывістых.

Такім чынам, усё забясьпечвае новаму савету работу ў кірунку пасьпяховага вырашэньня тых задач, якія ставіць рабочая кляса і яе партыя.

Важнейшай нашай задачай зараз зьяўляецца ўзмацненьне і далейшае пашырэньне сацыялістычнай прамысловасьці.

Пытаньні росту прадукцыйнасьці працы, узмацненьня працдысцыпліны, барацьбы з расхлябанасьцю і разгільдзяйствам на заводах і ва ўстановах,—усё гэта павінна заняць вялікае месца ў рабоце новага савету. Усёй сілай свайго аўтарытэту—гаспадара савецкай сталіцы—савет абрушыцца на ўсе дэмаралізуючыя зьявы ў вытворчасьці, на дэзэртыраў гаспадарчага фронту, якія аб'ектыўна твораць справу клясавага ворага.

Гарсавет займецца сапраўдным вырашэньнем пытаньняў гарадзкога, камунальнага і жыльлёвага дабрабыту, дакладна ўлічваючы і скарыстоўваючы дзелавыя прапановы рабочых.

Выразная клясавая лінія і рэвалюцыйная мэтазгоднасьць вырашэньня гэтых пытаньняў забясьпечана дырэктывамі рабочых сходаў, наказамі выбаршчыкаў.

Жорсткая сыстэматычная барацьба з бюракратызмам, з фармальнымі, папяровымі і хамскімі адносінамі ў апаратах і на заводах да працоўных, якую (барацьбу) разгорне гарсавет, у вельмі вялікай ступені дапаможа хутчэй перамагчы тормазы нашага будаўніцтва.

Не пералічыш усіх тых задач, вялікіх і малых, якія будзе вырашаць гарсавет. Іх шмат. Усе яны выцякаюць з таго грандыёзнага пляну сацыялістычнага наступленьня, які намеціла і праводзіць у жыцьцё рабочая дзяржава.

Пасьпяховасьць усёй работы гарсавету будзе залежаць галоўным чынам ад найбольшага ўцягненьня рабочых мас Менску ў штодзенную работу савету.

Склад новага савету, наказ выбаршчыкаў дэпутатам, гарантуюць, што гэта цесная сувязь савету з рабочымі масамі гораду ёсьць, што яна будзе непарыўнай, што на аснове яе будуць ажыцьцяўляцца чарговыя важнейшыя задачы сацыялістычнай будоўлі.

Як „цьвёрдалобыя" рыхтуюцца да выбараў

ВЫБУХ БОМБЫ У ЗАЛІ ІНДЫЙСКАГА ЗАКОНАДАЎЧАГА СХОДУ

Справа рук агэнтаў-правакатараў

ЛЁНДАН, 8. Агэнцтва Рэйтэр падае з Дэлі (Індыя): «Сёньня ў залі пасяджэньняў ангельска-індыйскага заканадаўчага сходу ў момант, калі старшыня Патэль закрыў пасяджэньне, былі кінуты дзьве бомбы, адна з якіх упала каля міністра фінансаў Шустэра. Некалькі членаў заканадаўчага сходу паранена. Бомбы разьбілі ўшчэнт лавы, якія займаюцца прыхільнікамі ўраду. Сход быў ахоплены некаторы час панікай. У сувязі з замахам арыштаваны 2 асобы, у якіх знойдзены бомбы і рэвальверы. Разам з бомбамі ў залю былі кінуты рэвалюцыйныя адозвы індыйскай сацыялістычнай рэспубліканскай арміі, падпісаныя ганаровым галоўнакамандуючым гэтай арміі Балраджэм. Арыштаваныя Бутоксэрара і Бгатсінг, як паведамляюць, прызналіся да віны».

***

ЛЁНДАН, 8. Па вестках агэнцтва Рэйтэр з Нью-Дэлі (Індыя) у адозвах, кінутых у залю заканадаўчага сходу адначасова з бомбамі, гаворыцца: «у той час, як ёсьць людзі, якія чакаюць, што атрымаюць ад камісіі Саймона раформу і нават загадзя ўжо змагаюцца з-за касьцей, што ім кінуты, урад рыхтуе новыя рэпрасіі супроць нас, накшталт закону аб грамадзкай бязапасьнасьці і закону аб прамысловых канфліктах. Арышт рабочых лідараў паказвае, куды дзьме вецер. Нихай прадстаўнікі народу падрыхтуюць масы да будучай рэвалюцыі».

***

ЛЁНДАН, 8. Выбух бомбы ў індыйскім заканадаўчым сходзе зноў прыцягнуў усеагульную ўвагу да Індыі. У левых колах шырока распаўсюджана думка, што выбух—справа рук агэнтаў-правакатараў. Выбухі чарадуюцца з дзіўнай рэгулявасьцю, і гэта наводзіць на думку, што яны адбываюцца ў адпаведнасьці з якімсьці плянам. Аглядальнік «Сэндэй Уоркэр» піша з гэтае прычыны:

«Кожны дзень прыносіць усё новыя довады таго, што кансэрватары разьлічваюць выкарыстать на выбарах трук «Індыя ў небясьпецы». Працэсы ў Мэруце (справа 31-го) будуць разыграны, як па нотах, з агапашэньнем усякага роду «сногсшибательных» улік і сэнсацыйных дакумантаў. У Англіі зьявяцца адпаведныя жахлівыя выкрыцьці».

Газэта ўказвае далей на дакладную апрацоўку грамадзкай думкі кансэрватыўным друкам, які піша аб хваляваньнях на індыйскай граніцы і напамінае аб апошніх паведамленьнях пешаварскага карэспандэнта.

«Дэйлі Тэлеграф» падае аб мнімай магчымасьці савецкага ўдару на Індыю. У заключэньне газэта спыняецца на варожасьці сунітаў і шыітаў у Курумскай даліне і піша:

«Гэтая варожасьць можа аказацца повадам ня толькі для ангельскага наскоку на Аўганістан, але і для чаго-небудзь іншага. Гэта амаль на працягу стагодзьдзя зьяўляецца аб'ектам пэрсідскіх імкненьняў і ці-ж цяпер у Лёндане не жадаюць бачыць Гэрат хутчэй у руках пэрсаў, чым у руках аўганацаў, якія жывуць у прыяцельскіх адносінах з Савецкім Саюзам? Прадаставіўшы Пэрсіі магчымасьць заняць Гэрат, Англія перацягне яе на свой бок і зможа атрымаць у сваю чаргу канцэсіі на паўднёвым узьбережжы Пэрсіі, якія замкнуць ланцуг імпэрскіх уладальнікаў ад Трыполі да Сіяму».

Пастанова ЦК КП(б)Б аб сьвяткаваньні 1-га мая

Сьвята 1-га мая ў бягучым годзе павінна прайсьці пад знакам мабілізацыі шырокіх працоўных мас навакол чарговых задач міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі і задач сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР.

Асноўнымі момантамі ў зьвязку з гэтым павінна быць:

1. Шырокая папулярызацыя дзейнасьці Камінтэрну ў зьвязку з дзесяцігодзьдзем яго існаваньня і апошнім (VI) кангрэсам.

2. Высьвятленьне ролі У. І. Леніна, як арганізатара і правадыра Камінтэрну.

3. Растлумачэньне росту ваеннай небясьпекі і неабходнасьці ўзмацненьня абароназдольнасьці СССР.

4. Растлумачэньне сутнасьці труднасьцяй рэканструкцыйнага пэрыяду.

5. Неабходнасьць рашучага наступленьня на прыватна-капіталістычныя элемэнты.

6. Змаганьне за падняцьце прадукцыйнасьці, вытворчай дысцыпліны, рэканструкцыю і інтэнсыфікацыю сельскае гаспадаркі ў зьвязку з веснавой пасеўнай кампаніяй.

7. Змаганьне з антысэмітызмам і праявамі шавінізму, узмацненьне інтэрнацыянальнага выхаваньня працоўных.

На падставе гэтага ЦК КП(б)Б прапануе АК:

1) Распачаць першамайскую кампанію не пазьней 15-га красавіка і не працягу часу да 1-га мая павінны па хатах-чытальнях, клюбах і чырвоных куткох праводзіцца гутаркі па асноўных пытаньнях сьвята.

2) 23-га красавіка павінна быць адзначана, як дзень нараджэньня У. І. Леніна, і ў гэты дзень высьветліць яго ролю, як арганізатара і кіраўніка Камінтэрну.

3) На працягу апошняга тыдню перад 1 мая ў клюбах хатах-чытальнях, і чырвоных куткох павінны быць праведзены масавыя вечары, прысьвечаныя 1 мая і дзесяцігодзьдзю Камінтэрну.

4) 1-га мая павінны быць наладжаны масавыя дэманстрацыі.

5) 2-е мая павінна быць выкарыстана для масавай сьвяточнай палітасьветнай работы (тэатры, кіно і інш.).

6) З прычыны таго, што дзень 1-га мая прыпадае на апошнія дні яўрэйскае пасхі і першыя дні праваслаўнай, усе дні першамайскіх сьвят павінны быць выкарыстаны для ўзмацненьня антырэлігійнай прапаганды.

ЦК КП(б)Б.

АМЭРЫКАНСКАЯ ПАЗЫКА КІТАЮ

НЬЮ-ЁРК, 6. «Нью-Ёрк Таймс» паведамляе, што банкірскі дом «Кунэнд Лэб К-о» распрацоўвае плян прадастаўленьня пазыкі Кітаю для набыцьця чыгуначнага абсталяваньня і пабудовы новых чыгунак. Сума мяркуемая пазыкі хістаецца паміж 100 і 500 мільёнамі долараў.

Газэта адзначае, што прадпасылкай для прадастаўленьня гэтае пазыкі зьяўляецца назначэньне вядомага амэрыканскага чыгуначнага адміністратара Джона Мантэля галоўным дарадцам усіх кітайскіх чыгунак. Як вядома, Мантэль на днях меў нараду з Гувэрам і хутка выяжджае ў Кітай у суправаджэньні 6 амэрыканскіх інжынэраў. Мантэль у гутарцы з прадстаўнікамі друку заявіў, што чыгуначнае абсталяваньне, якое маецца цяпер у Кітаі, дастаўлена пераважна Бэльгіяй, Англіяй і Францыяй. Па яго думцы, абсталяваньне кітайскіх чыгунак у будучым павінна быць амэрыканскім. Галоўнае кіраўніцтва Мантэля будзе знаходзіцца ў Шанхаі.

Рэфармістыя сарвалі забастоўку ў Бордо

ПАРЫЖ, 8. Забастоўка мэталістых у Бордо закончылася паражэньнем пасьля 65 дзён барацьбы. Як паведамляе «Юманіта», на сходзе, дзе была ўхвалена пастанова аб аднаўленьні работ, выступаўшыя рабочыя адобрылі кіраўніцтва ўнітарных прафсаюзаў і зазначалі на немагчымасьць працягваньня далей забастоўкі з прычыны яе зрыву аб'яднаными сіламі прадпрыемцаў і рэфармістых. (ТАСС).

Арышты на Філіпінскіх выспах

НЬЮ-ЁРК, 8 У Манілі (Філіпінскія выспы) арыштавана каля 70 чалавек па абвінавачаньні ў «пробах стварыць армію філіпінскай незалежнасьці». (ТАСС)

Саўгас „Гігант" гатоў да сяўбы

РАСТОЎ-ДОН, 9. 10-га і 11-га красавіка пачынаецца сяўба ў Сальскім саўгасе «Гігант» і ў Данскім узорным саўгасе. У першым будзе засеяна ярыною 48.700 гэктараў, у другім—7 тысяч. Усе патрэбныя трактары прыбылі і знаходзяцца ў поўнай гатоўнасьці. Трактары саўгасу «Гігант» у колькасьці 555 падзелены на 14 калён і выехалі на месцы сяўбы ў вызначаныя вучасткі. На абодвых саўгасах насеньне, інвэнтар і рабочыя ў ліку 3.000 чалавек у поўнай гатоўнасьці. Сяўба будзе весьціся паводле канвэрнага мэтаду і скончыцца ў працягу 5 дзён. Узораная з восені глеба добра ўцягнула вільгаць. 11.500 гэктараў азімых пасеваў саўгасу знаходзяцца ў яўсім здавальняючым стане. Настрой усіх працаўнікоў саўгасу ўзьняты, як перад вялікім сьвятам.

Абураючае галавацяпства

Даныя аб праведзенай частковай чыстцы дзяржапарату па СССР

МАСКВА, 9. На нарадзе, якая адбылася пры ЦК Саюзу Саўгандальслужачых, былі паведамлены цікавыя даныя аб праведзенай у радзе раёнаў частковай частцы дзяржапарату. Прадстаўнікі Украіны, Паўночнага Каўказу і Ленінградзкай вобласьці адзначылі, што чыстка дзяржапарату праводзілася без усялякай падрыхтоўкі і вельмі пасьпяхова. У Ленінградзе праверка апарату Дзяржстраху, дзе працуе 500 супрацоўнікоў, цягнулася 5 дзён. У Ленінградзкім фінадзеле, дзе занята 1000 чалавек, чыстка цягнулася два тыдні. На Паўночным Каўказы і Украіне праверка апаратаў цэлых раёнаў працягвалася ня больш двух месяцаў. З такой-жа пасьпяховасьцю праверка дзяржапарату праводзілася і ў Сібіры, Сярэдня-Волскім раёне, Бранску і г. д. Адгэтуль тыя значныя памылкі, якія наглядаюцца ва ўсёй працы па чыстцы дзяржапарату. Перш за ўсё трэба сказаць, што аб чыстцы рабочая грамадзкасьць амаль што і ня ведала. Праверка ўсюды праводзілася па анкетах, з прычыны чаго было шмат недарэчнасьцяй. На Украіне быў звольнены працаўнік фінансавай установы, які працуе там з 1917 году і мае асабовую грамату ад УсеУкраінскага ЦВК; у аднэй з каапэрацыйных арганізацый была звольнена супрацоўніца за тое, што яна «ня вывучыла задач хлебазагатовак», другая супрацоўніца—за тое, што яе бацька, які памёр у 1908 годзе, быў гандляром. У Бранску вычысьцілі дачку двараніна, які звыш 20 год працаваў кандуктарам на чыгунцы. На Паўночным Каўказе былі звольнены працаўнікі за тое, што яны... знадворнага выгляду падобны да афіцэраў. У значнай меры гэтыя памылкі былі выкліканы нездавальняючым складам саміх камісій па чыстцы апарату.

У сучасны момант чыстка спынена. Для пасьпяховага правядзеньня чысткі апарату неабходна ўстанавіць цьвёрдыя аднакі, якія могуць служыць падставай для вычышчэньня з апарату таго ці іншага працаўніка. Вычышчаныя з дзяржапарату бязумоўна павінны быць таксама выключаны і з прафсаюзаў. Працоўнае заканадаўства павінна быць зьменена ў тым сэнсе, каб для рэгістрацыі на біржы працы прадаўлялася даведка аб прычыне звальненьня. Гэтая мера папярэдзіць магчымасьць другі раз паступіць на службу ў дзяржапарат асоб, звольненых па чыстцы. Для гэтай-жа мэты павінны быць уведзены ва ўсіх установах паслужбовыя сьпісы.

80 навуковых экспэдыцый для вывучэньня СССР

Галоўнавука канчаткова распрацавала плян навуковых экспэдыцый і дасьледваньняў на 1929 год. Усяго мяркуецца арганізаваць 80 экспэдыцый і навуковых паездак у розныя раёны СССР.

Гідралёгічны Інстытут пасылае экспэдыцыі ў Ахоцкае і Японскае мора для акіянаграфічных дасьледваньняў па праграме, распрацаванай Інстытутам, супольна з Акадэміяй Навук. Мурманская біолёгічная станцыя будзе весьці работы па вывучэньні паўночных мораў па ўзгодненай міжнароднай праграме. Для гэтай мэты на поўнач, да кромкі ільдоў, будзе пасланa толькі што набытае ў Нарвэгіі і нанова абсталяванае судна «Мікалай Кніповіч». Плаўморнін арганізуе навукова-прамысловы і акіяна-графічныя экспэдыцыі ў Белае і Барэнцава моры, а таксама па Мурманскае ўзьбережжа.

У зьвязку з праблемай узьняцьця ўраджайнасьці вялікія экспэдыцыі накіроўваюцца Дзяржаўным Інстытутам па вывучэньні засушлівых вобласьцяй у Астраханскую і Сталінградзкую губэрніі для дасьледваньня глебы і культур розных расьлін. Інстытут Мінэралёгіі пасылае экспэдыцыі ў Прыбайкалье і Туркэстан для абсьледваньня месцанараджэньняў сьлюды і ванадзія. Акрамя таго, навуковыя работнікі гэтага інстытуту прымуць удзел у экспэдыцыі, якая арганізоўваецца трэстам «Редкие элементы» ў Забайкалье, для дасьледваньня вольфрамавых месцанараджэньняў.

Намечан таксама цэлы рад экспэдыцый па вывучэньні народнасьцяй Алтаю, зыран, асецін, бурата-манголаў, інгушоў і інш. Археолёгічныя інстытуты пасылаюць экспэдыцыі на Паўночны Каўказ, у Ольвію, Судак і на Таманскую паўвыспу. Навуковыя работнікі інстытуту гэаграфіі будуць праводзіць далей гэалёгічнае дасьледваньне ўсходніх Саян.

Усяго на арганізацыю навуковых экспэдыцый адпускаецца ў бягучым годзе 135.000 руб.

Заканчэньне пабудовы трох ваенных суднаў

ВІЛЬНЯ, 7. У французкай гавані Гаўр 12-га красавіка адбудзецца спуск на воду польскае падводнае лодкі «Вільк», 16-га ў гавані Каэн—контрмінаносца «Бужа», а 22-га—падводнае лодкі «Рысь».

(«Дз. Віл.»)

Прысьпешаная пабудова хэмічнага заводу

ВІЛЬНЯ, 7. Пабудова заводу штучных угнаеньняў у Тарнове адбываецца ў прысьпешаным тэмпе, так што замест лета 1930 году завод будзе гатоў летам гэтага году. («Дз. Віл.»).

Вялізны завод у Тарнове зьяўляецца асноваю польскай ваеннай хэмічнай прамысловасьці. У мірным часе ён будзе вырабляць штучныя азоцістыя ўгнаеньні, а ў часе вайны атрутныя газы. Пабудова гэтага заводу пачата ў сувязі з тым, што адзіны вялікі хэмічны завод у Хожаве ляжыць вельмі блізка ад нямецкае граніцы. Палажэньне заводу ў Тарнове больш захаванае. Надзвычайная сьпешка, з якою вядзецца пабудова заводу ў Тарнове, выглядае вельмі падазрона.

Запазычанасьць за французкую амуніцыю

ВАРШАВА, 7. У Парыж выяжджае спэцыяльная польская дэлегацыя для перагавораў аб ліквідацыі запазычанасьці за ваенную амуніцыю, атрыманую ад Францыі ў 1918-21 годзе. Агульная сума дасягае 859 млн. франкаў.

(«Кур. Варш.»).

КАНФІСКАЦЫІ

ВІЛЬНЯ, 4. Акруговы суд зацьвердзіў канфіскацыю «Беларускае Крыніцы» за артыкул «Пасьля суду над Грамадою». Рэдактар прыцягваецца да судовае адказнасьці. («Сл.»).

АПЭЛЯЦЫЙНЫ ПРАЦЭС БЕЛАГВАРДЗЕЙЦА—ВАЙЦЭХОЎСКАГА

ВАРШАВА, 7. Варшаўскі апэляцыйны суд пастанавіў назначыць на 25 красавіка перагляд справы Юрыя Вайцэхоўскага, які рабіў замах на гандлёвага прадстаўніка СССР у Польшчы т. Лізарава.

Суд пастанавіў выклікаць у якасьці дадатковага сьведкі сьледчага судзьдзю Т. Вітунскага. Патрабаваньне абароны аб назначэньні псыхіятрычнае экспэртызы адхілена. Таксама адхілена патрабаваньне аб выкліку ў якасьці сьведак кардынала Ропа і расійскага эмігранта Ул. Бурцава.

Паездка міністра замежных спраў у Румынію

ВАРШАВА, 7. У палове мая гэтага году польскі міністар замежных спраў выяжджае ў Румынію для перагавораў аб польска-румынскай гаспадарчай умове і аб перагляданьні польска-румынскай саюзнай умовы. («Роб.»)

УКРАІНСКІХ ВУЧНЯЎ САДЗЯЦЬ У КАРЦЭР

ЛЬВОЎ, 7. Дырэкцыя гімназіі ў Станіслававе (Зах. Украіна) выключыла трох украінскіх вучняў. 10 вучняў пасадзілі ў карцэр. Усе гэтыя вучні нібы-та перашкаджалі сьвяткаваньню дня нараджэньня Пілсудзкага. Вучні зьнялі партрэт Пілсудзкага са сьцяны і агітавалі супроць сьвяткаваньня.

ЗАБАРОНА САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫЧНАЙ ПАРТЫІ

ВІЛЬНЯ, 5. «Кур. Віл.». паведамляе, што ў літоўскіх урадавых сфэрах разважаецца думка аб абвяшчэньні літоўскай сацыял-дэмакратычнае партыі нелегальнаю.

ПОЛЬСКІ ФАШЫЗМ УЗБРОИВАЕЦЦА

Будуюцца хэмічныя заводы і ваенныя судны

ЗАКАНЧЭНЬНЕ ЗЬЕЗДУ ФРАНЦУСКАЙ КАМПАРТЫІ

Заклік да непаслабнай барацьбы з правай небясьпекай

За чыстку партыі ад трацкісцкіх элемэнтаў

ПАРЫЖ, 8. У спрэчках на зьезьдзе французкай кампартыі другі раз выступіў Дорыё. Адказваючы на зазначэньне прадстаўніка Выканкому Камінтэрну на неабходнасьць выразнае палітычнае заявы з яго боку, Дорыё сказаў, што ня партыя прышла да яго, а па меры ўсьвядамленьня сваіх палітычных памылак, ён сам прышоў да партыі. Аднак—кажа Дорыё,—яго пераканаў не націск зьверху, а кантроль зьнізу, пацьверджаны падзеямі. Дорыё рашуча адхіляе быццам ён няправільна ацэньваў эканамічнае становішча Францыі. Дорыё далей заявіў, што ён далучаецца да дэлегатаў, якія патрабуюць стварэньня палітычна аднароднага партыйнага кіраўніцтва. Дорыё адмовіўся ад выстаўленьня сваёй кандыдатуры ў палітбюро і заявіў, што будзе кіравацца рашэньнямі Камінтэрну ў практычнай рабоце, на якую яго пашле партыя.

Выступаючы ад імя палітычнай камісіі зьезду па пытаньні аб складзе ЦК і аб рэзалюцыі аб міжнародным становішчы і правай небясьпецы ў Камінтэрне, Сэмар зазначыў на недапушчальнасьць замазваньня палітычных разгаласьцяў. У прыватнасьці, гэта адносіцца да кіраўніку арганізацыі Поўначы. Адказваючы Дорыё, Сэмар напамінае, што толькі апублікаваньне пастановы палітбюро ЦК прымусіла яго незадоўга да зьезду спыніць тактыку маўчаньня, якая прыкрывала сур'ёзныя палітычныя разыходжаньні. «Дорыё — сказаў Сэмар,—канчаткова прыдзе да партыі, калі ён у штодзённай рабоце будзе супольна з ёю змагацца супроць усіх пэрымістых і апартуністых».

Сэмар агаласіў прапанову паліткамісіі аб складзе ЦК. Камісія прапануе скараціць лік членаў ЦК з 83 да 60 і ўвесьці ў склад яго вялікую колькасьць рабочых ад варштату. Адказваючы на супярэчаньні некаторых дэлегатаў, Сэмар указаў, што палітычнае адзінства кіраўніцтва не парушаецца ўключэньнем у ЦК Рэно Жана, які лёяльна праводзіць лінію партыі.

Зьезд КПФ аднагалосна пры адным устрымаўшымся ўхваліў рэзалюцыю аб міжнародным становішчы і аб правай небясьпецы ў Камінтэрне. 11 дэлегатаў зрабілі агаворку ў часьці рэзалюцыі, якая закранае крытыку памылак арганізацыі Поўначы. 6 дэлегатаў зрабілі агаворку да пункту, які асуджае так званую «левую меншасьць» парыскай арганізацыі.

Прызнаньне Дорыё сваіх памылак—сур'ёзная перамога партыі над правай небясьпекай. Устанаўляючы ў рэзалюцыі, што трацкісцкія групы ў СССР і капіталістычных краінах сталі яўна контр-рэвалюцыйнымі арганізацыямі, зьезд адобрыў усе меры УсеКП(б) супроць Троцкага і яго аднадумцаў. Зьезд заклікае ўсю партыю, не паслабляючы барацьбы з правай небясьпекай, бязьлітасна ачышчаць партыю ад трацкісцкіх элемэнтаў, аднаўчасова выкрываць групы Суварына, Маната, і Трэна, якія пасьля свайго палітычнага банкруцтва займаюцца антыкамуністычным і анты-савецкім цкаваньнем.

Зьезд заяўляе аб сваёй салідарнасьці з лініяй УсеКП(б), накіраванай на забесьпячэньне непаслабнага тэмпу індустрыялізацыі і на ўзмацненьне калектыўнага сэктару сельскае гаспадаркі. Зьезд,—гаворыцца далей у рэзалюцыі,—не сумняваецца, што партыя пераможна павядзе працоўных па шляху сацыялістычнага будаўніцтва.

Зьезд КПФ ухваліў прапанаваны палітычнай камісіяй склад ЦК 171 голасам супроць 2-х, пры 24-х устрымаўшыхся. Заяўлена 16 агаворак супроць увядзеньня ў ЦК Рэно Жана і 38—супроць Жакоба. Ад імя палітычнай камісіі Сэмар паведаміў, што камісія аднагалосна адхіліла просьбу Сюзанны Жыро аб зваротным прыёме яе ў партыю, лічачы, што ў яе заяве няма яснага прызнаньня сваіх памылак і гатоўнасьці змагацца з трацкізмам.

Пасьля заслуханьня дакладаў аб аргработе, работе ў каапэрацыі і сярод сялянства, зьезд аднагалосна пры адным устрымаўшымся, ухваліў палітычныя тэзісы аб становішчы ў Францыі і аб выбарчай тактыцы. Далей зьезд аднагалосна ўхваліў рэзалюцыю аб забастовачным руху і аб задачах работы партыі ў калёніях. Зьезд катэгарычна заяўляе аб недапушчальнасьці ні пры якіх умовах супольных з сацыялістымі сьпісаў. (ТАСС).

***

ПАРЫЖ, 8. Закрываючы зьезд, Сэмар назваў яго важным этапам на шляху да ідэёвага і арганізацыйнага ўмацаваньня КПФ. (ТАСС).

НАПЯРЭДАДНІ 6-й СЭСІІ ПАДРЫХТОЎЧАЙ КАМІСІІ ПА РАЗБРАЕНЬНІ

15-га красавіка адкрываецца ў Жэнэве шостая сэсія падрыхтоўчай камісіі да канфэрэнцыі па разбраеньні. Да гэтага часу пытаньнямі аб разбраеньні «займаліся» ўжо Сход Лігі Нацый, так званая Трэцяя Камісія Лігі, Рада Лігі, Сталая кансультацыйная камісія і яе тры падкамісіі, Часовая мяшаная камісія, камітэт вывучэньня і Спэцыяльная камісія, Камітэт Рады па пытаньнях разбраеньня, падрыхтоўчая камісія па разбраеньні. Вайсковая падкамісія А, падкамісія Б, мяшаная камісія з трыма камітэтамі. Камітэт Грамадзянскай Авіяцыі, Бюджэтны Камітэт і г. д. і г. д.

Усе гэтыя паважаныя органы мелі больш 120 сэсій, сонні пасяджэньні і ўхвалілі тысячы рэзалюцый. Адна толькі падкамісія А мела 189 пасяджэньняў, а рада Лігі за 8 год сваёй работы ўхваліла 111 рэзалюцый па пытаньнях разбраеньня.

Вынік-жа ўсяе гэтае справы... нуль.

Адзіным, але вельмі сумніцельным дасягненьнем усёй гэтай работы зьяўляецца «праект абмежаваньня ўзбраеньняў», ухвалены падрыхтоўчай Камісіяй у першым чытаньні. Назва гучная і шмат абяцаючая, але і яна прыкрывае абсалютна нулявы зьмест. У праекце няма ніводнай лічбы, няма ніякага агульнага крытэрыя, або прынцыпу скарачэньня ўзбраеньняў. Ёсьць толькі цьмяныя альгэбраічныя формулы, і пералік тых радоў зброі, якія трэба было-б скараціць. З прычыны таго, што ў аснове праекту ляжыць славуты прынцып безапаснасьці, дык (па думцы аўтара праекту) Англія з Амэрыкай, Англія з Францыяй, Амэрыка з Японіяй, Францыя з Італіяй, Італія з Юга-Славіяй, Польшча з Літвой, Румынія з Вэнгрыяй павінны спачатку дагаварыцца аб тым, наколькі кожная з гэтых дзяржаў лічыць сябе гарантаванай у адносінах безапаснасьці, і толькі пасьля гэтага ўстанавіць разьмеры армій для кожнай краіны.

Але і гэтага мала. Аказваецца, што нават, падпісаўшы канвэнцыю аб разбраеньні, кожная дзяржава можа яе ў любую хвіліну ануляваць.

«...Папершае, у выпадку ўзьнікненьня вайны (?!), падругое, у выпадку, калі гэтай краіне пагражае паўстаньне (!!) і патрэцяе, калі гэтае павялічэньне зроблена са згоды рады Лігі Нацый (!?)». Здаецца, што камэнтары тут непатрэбны.

***

Ня з такім разбройваючым багажом выступіла наша рэспубліка перад сусьветнай грамадзкай думкай. Мы мелі ў мінулым прапанову тав. Чычэрына аб усеагульным скарачэньні ўзбраеньняў на Гэнуэзкай канфэрэнцыі ў 1922 годзе, мы склікалі ў Маскве ў 1922 годзе канфэрэнцыю акраінных дзяржаў і прапанавалі ім прапарцыянальна скараціць узбраеньні; мы пасылалі нашага дэлегата на канфэрэнцыю марскіх экспэртаў у Рым у 1923 г. з радыкальнай прапановай аб скарачэньні флётаў. І ня гледзячы на тое, што ўсе сапраўдныя мірныя прапановы Савецкага ўраду правальваліся кіраўнікамі буржуазных дзяржаў, мы ня перасталі працаваць для справы міру.

Як выбухнуўшая бомба, прагрымеў па ўсім сьвеце ўнесены савецкай дэлегацыяй праект аб поўным скарачэньні ўзброеных сіл, аб поўным разбраеньні. Замяшанье ўсёй капіталі нельга было апісаць. І пасьля таго, як на трыбуну, у якасьці апошняга рэсурсу, быў выпушчан французкі сацыял-дэмакрат Польбанкур, які прабаваў сваім красамоўствам прыкрыць паніку сваіх калег, камісія пасьпяшыла... перанесьці абгаварэньне савецкага праекту на наступную сэсію. Выпрабаваны мэтад цяганіны!

На наступнай сэсіі ў сакавіку 1928 году адбылася генэральная атака савецкага праекту 19-ю дэлегацыямі. І мы можам з гонарам сказаць, што з гэтай «чысткі» савецкі праект вышаў бяз адзінае плямачкі, ні на іёту не скампрамэтаваным. Супроць ідэі ўсеагульнага разбраеньня пашы працаўнікі не змаглі выставіць ніводнага сур'ёзнага аргументу. Адзіна, што яны давялі (і пры гэтым дасканала, на ўвесь сьвет)—гэта тое, што яны і думаць ня хочуць аб разбраеньні. Мы гэта ведалі даўно, але заходня-эўрапейскім пралетарам, якія ашукваюцца панамі з II-га Інтэрнацыяналу, аб гэтым было карысна даведацца.

Але фармальна савецкі праект быў адхілены. І тут разарвалася новая бомба. Савецкая дэлегацыя ўнесла новую прапанову—праект частковага скарачэньня ўзбраеньняў. Зноў замяшанье, зноў абурэньне і зноў выпрабаваны прыёмчык—адтэрмінаваньне абгаварэньня да наступнай сэсіі.

***

Гэтай сэсіі прышлося чакаць даволі доўгі час. 13 месяцаў прайшло ад апошняй пятай сэсіі. 15-га красавіка адкрыецца ў Жэнэве 6-я сэсія, якая, відавочна, і будзе разглядаць другі савецкі праект.

Прызнацца, што ў нас няма поўнай упэўненасьці ў тым, што гэта сапраўды так будзе. Заўсёды можна прыдумаць больш-менш важную прычыну для новай цяганіны, тым больш, што гэты праект разбраеньня ўнесены ня Лігай Нацый, а ненавіснай савецкай дэлегацыяй. Праект гэты ставіць пытаньне рабром, патрабуе значнага скарачэньня ўзбраеньняў (напалову, адну трэць адну чэцьверць—у залежнасьці ад вялічыні ўзброеных сіл), у корані спыніць ліхаманку пераузбраеньняў і становіць на абарону мірнага насельніцтва ад жорсткасьцяй будучай вайны,—асабліва ад жахаў паветрана-хэмічнага нападу.

Усё гэта наўрад ці прыдзецца да густу урадам, якія шалёным тэмпам узбройваюцца. З якой радасьцю яны адхілілі-бы і другі савецкі праект. Бо да толькі ў тым, што гэта вельмі цяжка зрабіць, ня выкрываючы ўласнага нежаданьня разбройвацца. Вось у гэтым-та і сэнс пытаньня...

А. К—в.

ПАЛІТЫЧНЫ ДАГАВОР МАС

Даён тры таму назад у Цьвяры адбылася падзея вялізнай палітычнай важнасьці і значэньня. 9 тэкстыльных фабрык Цьвярской, Маскоўскай і Іванава-Вазьнясенскай губэрань уступілі ва ўсесаюзнае сацыялістычнае спаборніцтва і падпісалі ўрачысты дагавор на 100-процантнае выкананьне вытворчай праграмы бягучага гаспадарчага году. Гэта падзея, якая закончылася грандыёзнай 20-тысячнай дэманстрацыяй рабочых, лішні раз паказвае нам рост палітычнае самасьвядомасьці рабочых мас, якія цьвёрда і няўхільна ідуць па ленінскім шляху, па лініі выкананьня важнейшых дырэктыў, намечаных 15-м зьездам нашай партыі. Тэкстыльшчыкі далі абяцаньне ўсёй партыі і рабочай клясе нашага Саюзу ўзьняць прадукцыйнасьць працы, змагацца за аднаўлен

Адначасова з генэральнай чысткай шырэй вербаваць у партыю перадавых рабочых і батракоў

„Шырокая вярбоўка ў партыю рабочых, з аднаго боку, і чыстка КП(б)Б, з другога, яшчэ больш узмоцняць КП(б)Б, яшчэ цясьней зьвяжуць яе з рабочаю клясаю для таго, каб яшчэ больш шларкім тэмпам ісьці ў перад да сацыялізму“ *(З рэз. XII зьезду КП(б)Б)*

Не кампанейскім парадкам, а сыстэматычна
ВЕРБАВАЦЬ У ПАРТЫЮ ПЕРАДАВЫХ РАБОЧЫХ І БАТРАКОЎ

Зараз, калі партыя з усёй рашучасьцю паставіла пытаньне аб чысткі сваіх радоў ад чужых элемэнтаў і элемэнтаў, якія разлажыліся, вялікую вагу набывае пытаньне росту партыі за лік лепшых рабочых.

Даклад аб вярбоўцы рабочых у партыю быў зроблены гэтымі днямі на нарадзе сакратароў і апоргаў ячэек КП(б)Б Віцебскай гарадзкой арганізацыі. Былі паданы досыць цікавыя лічбы, якія характарызуюць рост арганізацыі за год.

Параўнальна з студзенем месяцам 1928 г. арганізацыя вырасла на 20 проц. ці па 814 чал. Найбольшы рост дае першы квартал 1928 г.—613 чал. Гэта яшчэ раз пацьвярджае тое становішча, што ячэйкі разьвіваюць адпаведную работу па вярбоўцы ў партыю рабочых у кампанейскім парадку.

У выніку росту арганізацыі ўдзельная вага рабочага ядра значна вырасла і складае зараз 66,9 проц. Група сялян паменшылася на 2,8 проц., а служачых —на 1,6 проц.

Сярод прынятых у партыю жанчын усяго 158 ці 18,8 проц.

Калі прасачыць рост арганізацыі па раёнах, то кідаецца ў вочы няроўнамернасьць росту партыі за лік паасобных груп працоўных. Так, Пралетарска-Слабодзкі раён, які мае на свабе тэрыторыі фабрыку «Дзьвіну» з паўтаратысячнай арміяй работніц, вырас за іх лік усяго толькі на 36 чал., Віцебскі раён, які мае вялікую колькасьць саўгасаў і кампактную масу батрацтва, прыняў у партыю за год усяго... 1 батрака. Лёзьнянскі раён—2 батракоў.

Якія-як асноўныя прычыны слабага росту партыі за лік рабочых, работніц, батракоў, бяднейшых сялян? Галоўная з іх—невыстарчальная ўвага гэтаму пытаньню з боку райкомаў і парт'ячэек. Звычайна ўся ўвага на гэтае пытаньне накіроўваецца ў часе Кастрычнікавых ці Ленінскіх дзён. Пытаньні росту партыі ў большасьці ячэек і нават райкомаў партыі ня ставіліся. З 14 райкомаў КП(б)Б толькі 9 райкомаў пытаньне гэта абгаворвалі і далі практычныя паказаньні ячэйкам. Такі буйны парткалектыў, як на «Чырвоным Металісьце», за ўвесь год ні разу не абгаворваў гэтага пытаньня. У ячэйцы фабрыкі «Самаход» ёсьць такія настроі: «усіх лепшых рабочых мы ўжо ўцягнулі, цяпер няма за лік каго расьці».

Зразумела, што на росьце партыі адбіваецца і невыстарчальна разгорнутая масавая арбота. Гэта асабліва характэрна для вясковых ячэек, дзе пры адпаведнай увазе можна было-б уцягнуць у партыю батрацкі актыў.

Я.

Чытаньні чысткі абмяркоўваем на сходах ячэек
(Мазыр)

Мазырскай АКК КП(б)Б падведзены папярэднія вынікі падрыхтоўкі акруговай партарганізацыі да чысткі партыі.

Пытаньні чысткі партыі зараз-жа пасьля XII зьезду КП(б)Б былі абгаворваны на прэзыдыуме АКК, бюро АК, аб'яднаным пленуме АК і АКК, на 10 райпартсходах.

Гэтае-ж пытаньне было абмеркавана на адкрытых сходах гарадзкіх партыйных ячэек з удзелам беспартыйнага актыву. Актыўнасьць на сходах пры абгаварэньні пытаньня чысткі партыі была вялікая, выступленьні ў большасьці сваёй насілі выкрываючы характар. Выступаўшыя завастралі ўвагу на паасобных хваравітых зьявах, якія маюць месца сярод асобных камуністых.

Так, на сходзе ячэйкі фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік», заводу «Пралетары» выступалі беспартыйныя рабочыя, якія маюць вялікі вытворчы стаж і выкрывалі асобныя моманты разлажэньня некаторых партыйцаў і асабліва тых, якія прымазаліся да партыі. Былі выяўлены на гэтых сходах былыя штрэйкброхэры, якія зрывалі рабочыя забастоўкі ў 1905-7 г. г. на мазырскіх фабрыках б. «Маланка» і «Прыма».

За выключэньнем выступленьня аднаго сакратара парт'ячэйкі супроць генэральнай чысткі партыі, які даводзіў, што чыстка павінна праводзіцца ў штодзённай працы,—уся партарганізацыя прызнала неабходнай і своечасовай чыстку партыі і патрабавала яе неадкладнага праведзеньня.

Б. Ш.

Аб сацыяльным складзе і росьце арганізацыі
(Кастрычнікаўскі раён, Менск)

Пленум ЦК УсеКП(б) і 12 зьезд КП(б)Б прынялі пастанову аб тым, каб да канца 1930 году рабочыя ад варштату ў партыі складалі ня менш 50 проц.

Гэта дырэктыва партыі ставіць перад раённай партарганізацыяй задачу—дакладна праверыць мэтады штодзённай культурна-масавай і партыйнай работы з тым, каб забясьпечыць усімі практычнымі мерапрыемствамі ажыцьцяўленьне данай партыяй дырэктывы.

Які-ж твар нашай раённай партарганізацыі па сацыяльным становішчы, па родзе заняткаў і інш.? Адказ на гэтыя пытаньні пакажа, наколькі важна дырэктыва партыі аб узмацненьні вярбоўкі рабочых і паляпшэньні сацыяльнага складу нашай партыі.

Раённая арганізацыя на 1-га красавіка 1929 г. налічвае 2.872 членаў, в іх 845 кандыдатаў партыі.

Па сацыяльным становішчы члены партыі падзяляюцца так: рабочых—66 проц., сялян—10.6 проц., служачых—23,4 проц. У ліку кандыдатаў: рабочых—64 проц., сялян—14 проц., служачых—22 проц. З гэтых даных відаць, што процант служачых надзвычайна вялікі. Але якая-ж тэндэнцыя росту, як і за лік каго іншу прыём з часу раённай канфэрэнцыі?

З 1-га красавіка г. г. было падана заяў аб прыёме: рабочымі—119, сялянамі—9, служачымі—9. Прынята-ж рабочых—91, сялян—8. служачых—2.

Рост, такім чынам, ішоў у абсалютнай большасьці за лік рабочых. З 91 прынятага рабочага ад варштату—77 чал., рэшта—вучні (рабфак, вайсковыя ўстановы).

Але трэба прызнаць зусім нездавальняючым процант няпрынятых (на адсэў рабочых падае 24 проц., сялян—12 проц., служачых—78 проц.).

У арганізацыі налічваецца рабочых непасрэдна ад варштату (разам з кандытамі) 39 проц., служачых апарату—31 проц., вучняў—14 проц., і г. д. Адгэтуль зусім відавочна задача ўзмацненьня вярбоўкі перадавых рабочых у рады партыі з тым, каб да канца 1930 году рабочых ад варштату ў партыі было ня менш 50 проц.

Усяго ў складзе арганізацыі жанчын 353 або 12,2 проц. Гэты процант ніжэйшы, чым па ўсёй КП(б)Б. А як ішоў прыём у апошні час за кошт жанчын. Гэты вучастак работы (прыём у партыю жанчын) зьяўляецца небясьпечным і на яго трэба зьвярнуць увагу, каб палепшыць якасьць работы сярод работніц і ўзмацніць рост арганізацыі за лік работніц.

Асноўны вывад з прыведзеных даных зводзіцца да таго, што трэба прызнаць: а) слабы колькасны рост арганізацыі (101 чал. за 4 месяцы), а таксама невыстарчальны яшчэ рост за лік рабочых, што працуюць непасрэдна ля варштату (77 проц.); б) высокі процант адсеву рабочых (24 проц.) тады, як адсеў сялян складае ўсяго 12 проц.; в) надзвычайна нездавальняючую ў колькасных і якасных адносінах тэндэнцыю росту за лік жанчын і, галоўным чынам, за лік работніц ад варштату.

Такія вывады з аналізу складу арганізацыі.

Якія-ж умовы для росту і паляпшэньня свайго сацыяльнага складу мае Кастрычнікавая раённая арганізацыя і дзе хаваюцца прычыны такога становішча ў росьце арганізацыі: Некаторыя таварышы лічаць, што «ўсё лепшае ўцягнута ў партыю і перспэктывы росту ячэйкі надзвычайна абмежаваны». Досыць паглядзець на рэзэрвы, якія ёсьць у рабочай клясы,—у выглядзе растучых кадраў беспартыйнага пралетарскага актыву ў прафсаюзах, у саветах, у каапэрацыі, у дэлегацкіх сходах, у камсамоле, добраахвотных таварыствах.—як стане ясным нягрунтоўнасьць вышэйпаданых гутарак. Зусім зразумела, што такія разважаньні адмоўна ўплываюць на рост і патрабуюць рашучай барацьбы з імі. Возьмем, напрыклад, партыйную праслойку нашых прадпрыемстваў. Што мы тут маем? Перш за ўсё, рэзэрвы для росту партыі. Так, на прадпрыемстве «Бальшавік» рабочых 665 чал., а камуністых —29 проц., рабочых вагонных майстэрань—505 чал., камуністых—25 проц., рабочых дэпо—315 чал., камуністых—24 проц.; «Адраджэньне»—529 чал., камуністых—6,5 проц., шчотачная фабрыка 670 чал., камуністых—5 2 проц., сьпіртазавод—51 чал., камуністых—75 проц., каўбасная фабрыка—47 чал., камуністых 54 проц.

Гэтыя даныя паказваюць на тое, што чым буйнейшае прадпрыемства, тым ніжэй партпраслойка і тлумачыцца гэта ў першую чаргу тым, што мы слаба разгарнулі штодзённую культурна-масавую партыйную работу, якая ня зусім адпавядае ступені і культурнаму росту пралетарскіх мас.

І. КОНЮХАЎ.

(Працяг будзе).

Партарганізацыя Віцебшчыны рыхтуецца
(Гутарка з т. Мундау—старшынёю Віцебскай АКК)

На агульнагарадзкіх актывах, на раённых партыйных сходах, на сходах вытворчых ячэек, пастанова лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б) аб генэральнай чысткі партыі была аднадушна падтрымана.

АКК разгарнула шырокую падрыхтоўчую работу да надыходзячай чысткі. Цэнтр увагі ў гэтай рабоце быў накіраваны на растлумачэньне партыйным і беспартыйным масам рабочых мэт і задач чысткі партыі і на прапрацоўку практычных пытаньняў, зьвязаных з чысткай.

За люты месяц па лініі Віцебскай АКК праведзена 9 сходаў райпартарганізацый, прысьвечаных пытаньням чысткі партыі. Акрамя таго, быў зроблены інструкцыйны даклад аб чысткі партыі на нарадзе ўсіх сакратароў райкомаў.

Партыйныя масы прынялі актыўны ўдзел у абмеркаваньні пытаньня аб чысткі партыі. Усе выступленьні на сходах зводзіліся да таго, што пры праведзеньні чысткі трэба ўзяць рашучы курс на вызваленьне партыі ад чужых элемэнтаў, элемэнтаў, якія прымазаліся, разлажыліся, ад бюракратаў, хвасьцістых і г. д.

Партыйцы падавалі канкрэтныя факты, якія сьведчаць аб разлажэньні некаторых нават адказных камуністых.

Вось т. Ш.—камуністы, былы камандзір, дэмабілізаваны з Чырвонай арміі з прычыны страты працаздольнасьці, мае 3 ордэны Чырвонага Сьцягу, а зараз ён жыве ня так, як належыць камуністаму.

— У нас ёсьць камуністыя,—гаварылі партыйцы на сходах,—якія маюць буйныя гаспадаркі, а ў калектыў ні ў якім разе ісьці ня хочуць. Яны хутчэй аддадуць свой партбілет, чым пойдуць у калектыў. Такіх «камуністых» трэба гнаць з радоў партыі.

Практычныя мерапрымствы па падрыхтоўцы да чысткі, як складаньне характарыстык, падрыхтоўка і падбор партыйнаў у камісіі па чысткі, падрыхтоўка матар'ялаў—ужо праводзяцца ў жыцьцё. Аднак, трэба адзначыць, што ў гэтым напрамку работа адпаведных арганізацый стаіць яшчэ не на належнай выпышні.

Дрэнна таксама ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы да чысткі партыі насьцензаэты на прадпрыемствах. Тут яшчэ шмат чаго прыдзецца зрабіць.

50 адказных працаўнікоў прымацаваны да вытворчых ячэек

У мэтах узмацненьня партработы на прадпрыемствах, падвяшчэньня працоўнай дысцыпліны і разгортваньня масавай работы, згодна пастановы бюро Віцебскага акругкому КП(б)Б, да фабрык прымацоўваюцца на паўтары месяцы ў распараджэньне бюро ячэек 50 адказных працаўнікоў кіруючага акруговага актыву.

Я—н.

Нацкая ячэйка намечана першай да чысткі
(Гутарка з тав. Сьвірыдавым, старшынёю Аршанскай АКК)

Пытаньні чысткі абгаворваны на раённых партыйных сходах, вытворчых ячэйках. Партыйцы выказаліся за рашучую чыстку радоў партыйнай арганізацыі, за самы цьвёрды курс на вызваленьне партыі ад «ліпавых» камуністых, ад элемэнтаў, якія прымазаліся і разлажыліся. Праведзен рад канкрэтных практычных мерапрыемстваў. Ужо окладзены характарыстыкі на камуністых, якія маюць за сабой сур'ёзныя партыйныя праступкі. Выяўлена таксама ідэалёгічная няўтойлівасьць некаторых камуністых, як напрыклад, непартыйныя адносіны да пытаньня калектывізацыі і г. д.

Нацкая ячэйка КП(б)Б (Крупскі раён) намечана першай для праведзеньня чысткі. У гэтай ячэйцы ведзецца асаблівая падрыхтоўчая работа да чысткі.

Многія райкомы і ячэйкі па аўтнасьці справы ўжо «чысьцяць». Амаль на ўсіх пасяджэньнях бюро райкомаў выключаюцца з партыі выбуленыя ячэйкамі камуністыя, якія разлажыліся, адарваліся ад партыі, зрабіліся для яе балястам.

Аднак, здавальняючай падрыхтоўчую работу да чысткі партыі назваць нельга, пакуль шырокія масы рабочых яшчэ невыстарчальна ўцягнуты ў гэту работу.

Гэты недахват партыйнага арганізацыі Аршаншчыны павінны ўлічыць і прыняць тэрміновыя меры да яго зьнішчэньня.

Пленум ЦКК КП(б)Б

Аб падрыхтоўцы да чысткі савецкага апарату

Зробім наш савецкі апарат такім, які патрэбен рабочай клясе, які будзе спраўляцца з выкананьнем задач партыі па сацыялістычным будаўніцтве

З дакладу тав. РЫСКІНА

ЗА КЛЯСАВА - ВЫТРЫМАНЫ, ПРАЦАЗДОЛЬНЫ АПАРАТ

Надыходзячая чыстка савецкага апарату зьяўляецца неабходнай умовай далейшага посьпеху нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Мы ня можам выканаць задач індустрыялізацыі краіны і рэканструкцыі сельскае гаспадаркі бяз сумленнага, клясава-вытрыманага і працаздольнага апарату.

Здаровы ў цэлым, наш апарат яшчэ хварэе бюракратызмам, чыноўніцтвам, падхалімствам і цяганінай. Ва многіх установах сядзяць «былыя» людзі, якія нездольны і не жадаюць праводзіць лінію партыі і савецкай улады. Нэпманы, спэкулянты, жандары і белагвардзейцы засьмечваюць наш апарат, тармозяць яго работу і скажаюць нашу клясавую палітыку.

Ясна, што ад такіх шкоднікаў, ад хабарнікаў, бюракратаў і падкулачнікаў мы павінны, як мага хутчэй, вызваліцца.

ЧЫСТКА АХОПІЦЬ УВЕСЬ АПАРАТ ЗЬВЕРХУ І ДА НІЗУ

Чыстка будзе масавай. Яна ахопіць увесь савецкі, гаспадарча-каапэрацыйны і гандлёвы апарат. Будуць правяраца ўсе цэнтральныя і нізавыя ўстановы і арганізацыі. Гэта генэральная праверка ўсяго апарату патрабуе вялікага напружаньня сіл. Часу да пачатку чысткі засталося мала. У пачатку мы меркавалі пачаць чыстку з 15-га красавіка, але выканаць гэта будзе немагчыма.

На мясцох падрыхтоўчая работа да чысткі праходзіць слаба. Цэнтральныя ўстановы таксама да яе не падрыхтаваліся. Таму тэрмін чысткі прышлося зьмяніць. Зараз ЦКК-РСІ ўхваліла пастанову аб тым, што органы РСІ павінны в 1-га мая прыступіць да чысткі і праверкі савецкага апарату.

Май набліжаецца. Час, які мы маем, павінен быць максымальна скарыстаны на падрыхтоўку да чысткі.

ПРЫНЦЫП ЧЫСТКІ — РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ МЭТАЗГОДНАСЬЦЬ

Асноўным прынцыпам пры праведзеньні чысткі будзе—рэвалюцыйная мэтазгоднасьць. Фармальны, мэханічны падыход пры праведзеньні чысткі недапушчальны. Трэба выявіць і выгнаць з нашага апарату толькі сапраўдных бюракратаў, сапраўдных ворагаў партыі і рабочае клясы.

Мы павінны асьцярожна падыйсьці да праверкі тэй часткі служачых, якая паходзіць з сацыяльна-чужых клясаў. Ёсьць сярод іх сумленныя савецкія працаўнікі, якія на справе давялі сваю адданасьць савецкай уладзе. Ці трэба чысьціць гэтых працаўнікоў толькі за іх службу ў царскіх установах? Зразумела, не. Асабліва чулым павінен быць падыход да спэцыялістых, сярод якіх мала выхадцаў з рабочых і сялян.

Чыстку трэба праводзіць так, каб вычышчаныя з адных устаноў ні ў якім выпадку не змаглі трапіць у іншыя.

УСЯ ЎВАГА ПАДРЫХТОЎЦЫ

Галоўнай задачай, якая забясьпечвае пасьпяховае праведзеньне чысткі савецкага апарату, зьяўляецца мабілізацыя грамадзкае думкі вакол гэтага пытаньня. Толькі пры самым шырокім падтрыманьні з боку рабочае клясы і ўсіх працоўных мы здолеем правільна і безбалюча правесьці чыстку

Замест вычышчаных бюракратаў і хабарнікаў трэба вылучыць новых працаўнікоў з рабочых, батракоў і бедноты.

Ці гатовы мы да чысткі апарату? Трэба проста сказаць—не! На мясцох недапушчальна слаба рыхтуюцца да праведзеньня чысткі. Падрыхтоўка матар'ялаў самімі ўстановамі амаль не вядзецца, а калі і вядзецца, дык часта ідзе на няправільным рэчышчы.

У цэлым радзе цэнтральных устаноў, а таксама і акруговых, у прыватнасьці ў Гомелі і Бабруйску, наглядаецца фармальны падыход да падрыхтоўкі матар'ялаў на служачых, што падлягаюць чысткі. Там складаюцца, прыкладна, такія характарыстыкі: б. дваранін, сын папа, былы афіцэр, б. валасны пісар, б. паштовы чыноўнік і г. д. Акрамя гэтага—больш нічога не зазначаецца.

Ці трэба гаварыць, што пры такім фармальна бюракратычным падыходзе можна дапусьціць рад агіднасьцяй і вычысьціць каштоўных для нас працаўнікоў? Пытаньнем падрыхтоўкі зьмены ніхто не займаўся. Рабочыя брыгады для праведзеньня чысткі і для замены зьнятых пры чысткі з работы толькі праектуюцца.

Друк, які прарабіў вялікую работу па падрыхтоўцы да чысткі, на мабілізацыі грамадзкае думкі, не займаецца дэтальнай распрацоўкай гэтага пытаньня. Насьценгазэты на пытаньні чысткі не зьвяртаюць ніякай увагі.

Усё гэта прымушае нас біць трывогу і дамагацца рашучага пералому ў справе падрыхтоўкі да праведзеньня чысткі апарату.

Спрэчкі па дакладу тав. Рыскіна

Спрэчкі па дакладу тав. Рыскіна былі накіраваны на абгаварэньне задач і мэтадаў надыходзячай чысткі

Па дакладу выступіў член ЦКК УсеКП(б) тав. Беленькі.

З ПРАМОВЫ тав. БЕЛЕНЬКАГА

Пры абгаварэньні пытаньняў, зьвязаных з чысткай апарату, мы мала заглядваем у мінулае, слаба ўлічваем практыку праверак нашых устаноў, што праводзіліся раней. Мы-ж чысьцілі і правяралі савецкія ўстановы і арганізацыі, ня раз, аднак, апарат усё-ж працуе ня добра. Гэта тлумачыцца тым, што пытаньні чысткі савецкага апарату надзвычайна слаба зьвязваліся з пытаньнямі падрыхтоўкі зьмены.

Адбываліся іэрархічныя і геаграфічныя зьмены ў нашым апараце, але вычышчаныя з адных устаноў прымайстроўваліся на работу ў другія.

— Мы яшчэ не навучыліся працаваць парэвалюцыйнаму. Маладая энэргічная сіла, якая можа перарабіць увесь апарат, нашы камсамольцы, вузаўцы, рабфакаўцы ў апарат слаба ўцягваюцца.

Тав. Беленькі падаў некалькі фактаў, якія гавораць за тое, што ў капіталістычных краінах у справе рацыяналізацыі прамысловасьці кіруючае месца належыць маладым інжынэрам і тэхнікам. У нас-жа рацыяналізацыя як вытворчысьці, так і дзяржаўнага апарату праводзіцца бяз удзелу моладзі.

Нашы маладыя спэцыялісты сустракаюцца ва ўстановах і прадпрыемствах в недавер'ем, і не навучаюць, старыя часта сьвядома іх заціраюць. Ёсьць шмат фактаў, калі скончыўшыя ВНУ абіваюць бокі на біржах працы, як беспрацоўныя. Між тым, гэта маладая тэхнічная сіла ў большасьці савецкая, ёй належыць будучыня, ад яе можна чакаць сьвежай творчай мысьлі, рэвалюцыйнай энэргіі.

Адсюль вывад: больш сьмела высоўваць моладзь на кіруючую работу; у справе рэканструкцыі і ўдасканаленьня нашага апарату рашаючае слова можа сказаць толькі моладзь.

— У нас палова апарату складаецца з бядуючых, бязініцыятыўных чыноўнікаў, якія працуюць надзвычайна кепска, падхалімствуюць, падлажваюцца так, што ў іх часта з фармальнага боку ўсё як быццам-бы ў парадку.

Галоўная прычына ўсіх бялячак нашага апарату ляжыць у гэтай чыноўніцкай масе. Князі, памешчыкі і дваране, што пралезьлі ў наш апарат, нам менш небясьпечны, іх параўнальна мала, іх трэба і можна вычысьціць зараз-жа. Больш цяжка пазбавіцца вялікай масы бязініцыятыўных чыноўнікаў, якія нездольны абслугоўваць масавую працоўнае насельніцтва краіны. Іх трэба сыстэматычна вычышчаць, бязупынна ўлічваючы новыя сьвежыя кадры.

Тав. КАЛНІН у сваім выступленні падкрэсьліў вялікае практычнае і палітычнае значэньне прынцыпу рэвалюцыйнай мэтазгоднасьці. У адносінах да праведзеньня чысткі сярод спэцыялістых тав. Калнін сказаў:

— Пры чыстцы складу спэцыялістых перад намі паўстаюць значныя труднасьці, бо ў нас мала пралетарскіх спэцыялістых. Аднак, калі хоць і самы кваліфікаваны спэц зьяўляецца яўным бюракратам, які скажае нашу клясавую палітыку, дык такога трэба выгнаць з савецкага апарату.

Далей тав. Калнін спыніўся на задачах падрыхтоўкі зьмены вычышчаным.

Тав. Заінчкоўскі (Бабруйск) адзначыў слабую падрыхтоўку да чысткі апарату з боку Бабруйскіх арганізацый.

— Калі мы хацелі паставіць пытаньне аб чысткі апарату на прэзыдыуме Бабруйскага АВП, дык там прышлі ў жах:

— Як гэта мы самі будзем абгаворваць такое пытаньне?

Тав. Левін (Менск) паказвае на тое, што прафсаюзы зусім ня рыхтуюць зьмены вычышчаным.

Тав. Зямляк раіў праверыць апарат біржа працы і склад беспрацоўных, сярод якіх ёсьць шмат непрацоўных элемэнтаў. Трэба пачысьціць банкаўскі апарат. Там засела ня мала былых людзей. Былі выпадкі, калі вычышчаныя з мазырскіх устаноў прыладжваліся на работу ў Гомелі. Гэтаму трэба пакласьці канец.

— Многія адказныя камуністыя,—кажа тав. **Цёмкін**,—сьвядома прымаюць на службу вычышчаных шкоднікаў і спэкулянтаў. Віцебская АКК выгнала з хлебазагатоўчых органаў 4 спэкулянтаў, але іх чамусьці адразу-ж прынялі на работу іншыя арганізацыі.

— У органах НКЮ,—гаворыць тав. **Сташэўскі**,—засела нямала варожых элемэнтаў. Пракуратуру і суд трэба пачысьціць вельмі сурова.

Тав. ВІНАГРАДАЎ разьвівае думку аб выданьні спэцыяльнага закону, які-б забараніў варожым элемэнтам працаваць у савецкіх установах. Гэтым мы абаронім свой апарат ад засьмечваньня.

У спрэчках выказаліся яшчэ т. т. Жукаў, Мільграм, Канапельскі, Русецкі і інш.

Пяцігодка БССР--на грамадзкі агляд

(На аб'яднаным пасяджэньні Савету Народных Камісараў і Эканомнарады 8-га красавіка)

Плянавая работа БССР атрымала высокую ацэнку ў саюзных органах.—Пляны БССР не перапавялічаны.—Мы кожны дзень атрымліваем больш магчымасьцяй, як гэта прадугледжана плянамі.

Уступнае слова тав. Каркліна

СТАДЫІ ПРАХАДЖЭНЬНЯ ПЯЦІГОДКІ

Пасьля 17-га студзеня, калі мы заслухалі ў ВСНГ зводны даклад,—г. зн. першыя асноўныя ўстаноўкі разьвіцьця нашага пэрспэктыўнага пяцігадовага пляну, мы атрымалі дырэктыву—весьці далейшую прапрацоўку пытаньняў пяцігодкі з тым, каб не прадставіць на канчатковае зацьвярджэньне СНК. Зараз мы ўжо правялі гэтую работу і падаем яе на зацьвярджэньне СНК для таго, каб гэты ўдасканалены плян потым прадставіць усебеларускаму зьезду саветаў.

Якая работа была за гэты час прароблена дзяржплянам раней, чым прадставіць нашы вычэрпваючыя прапановы? XII-ты зьезд КП(б)Б, што нядаўна адбыўся, заслухаў наш даклад аб пяцігодцы і даў нам асноўныя палітычныя і практычныя ўстаноўкі, даў нам рад канкрэтных дырэктыў і лімітаў, якія мы ўлічылі ў нашай практычнай рабоце.

Пасьля гэтага намі была праведзена яшчэ іншая глыбокая работа. Мы ставілі наш даклад у саюзным Дзяржпляне, пасьля гэтага мы прымалі ўдзел на 5-м зьезьдзе дзяржаўных плянавых работнікаў, на якім абмяркоўвалася пяцігодка Саюзу ў раённым разрэзе. Там мы атрымалі дадатковыя ўказаньні і матар'ялы для арыентыроўкі і для больш сьмелага праектаваньня асабных праблем разьвіцьця беларускай народнай гаспадаркі. Нарэшце, нядаўна мы мелі магчымасьць удзельнічаць у шырокім абмеркаваньні пяцігодкі на пасяджэньні саюзнага СНК.

МЫ ЗАРАЗ МОЖАМ БОЛЬШ СЬМЕЛА ФАРМУЛЯВАЦЬ НАШЫ ЎСТАНОЎКІ

Гэта ўзаемнае абмяркоўваньне нашых матар'ялаў у саюзных органах і наш удзел у абмеркаваньні саюзных матар'ялаў далі нам яшчэ большую ўпэўненасьць для распрацоўкі асобных тэм, для больш канкрэтнай і сьмелай фармулёўкі нашых установак.

ПЯЦІГОДКА Ў АКРУГОВЫМ РАЗРЭЗЕ

Мы таксама стараліся даць матар'ялы ў межах магчымага ў акруговым разрэзе. Мы за гэты час выявілі думкі акруг і сёньня можам прадставіць першыя прыблізныя намячэньні пяцігодкі ў акруговым разрэзе па галоўных разьдзелах.

Дзяржпляну за апошні час прышлося вытрымліваць моцны націск з боку некаторых таварышоў, якія натрабавалі прадстаўленьня амаль што поўнай пяцігодкі ў акруговым разрэзе. Акруговыя працаўнікі хацелі паставіць на акруговых зьездах саветаў пытаньні аб акруговай пяцігодцы, што зусім правільна, бо зараз гэта зьяўляецца важнейшай тэмай. Але нельга натрабаваць немагчымага, бо з пяцігодкай жартаваць нельга. Усе-ж ведаюць, як доўга і многа мы працавалі над нашай пяцігодкай у рэспубліканскім маштабе Прыблізна тры гады мы працавалі і толькі сёньня можам прадставіць гэты плян у больш менш вычарпальным выглядзе. А распрацоўка пяцігодкі ў акруговым разрэзе—гэта таксама вельмі сур'ёзная задача. Тут павінны быць дэталізаваны пляны, паглыблена пытаньне іх практычнага ажыцьцяўленьня.

Тым ня менш мы не супярэчым супроць таго, каб таварышы ставілі дакляды аб пяцігодцы на акруговых зьездах, але гэта павінна рабіцца асьцярожна, ў выгляд [illegible] установак, перавым разрэзе. Усебеларускі зьезд саветаў вынесе канчатковую пастанову і толькі пасьля гэтага акругі змогуць праз якіх-небудзь паўгода скласьці свае пяцігодкі ўжо больш-менш угрунтаванымі.

НАМ УДАЛОСЯ АМАЛЬ ШТО НА 100 ПРОЦ. ПРАДБАЧЫЦЬ УСТАНОЎКУ САВЕЦКАГА САЮЗУ

Калі мы ўпяршыню прадставілі ў СНК нашу пяцігодку, мы амаль што ня мелі саюзных матар'ялаў, мы мелі тады толькі ўласны багаж, трэба сказаць, багаж даволі мізэрны і сваю ўласную практыку плянаваньня БССР. Але я пайнен з гордасьцю адзначыць, што, ня гледзячы на наліччa такога мізэрнага матар'ялу, нам усё-ж такі ўдалося на 99 проц. дакладна прадбачыць устаноўку Савецкага Саюзу. Гэта было адзначана на пасяджэньні саюзнага СНК і на V-м зьезьдзе плянавых працаўнікоў. Там была дана ацэнка нашай работы ў тым сэнсе, што Беларусь першая прадставіла матар'ялы больш капітальна прапрацаваныя, больш глыбокія, чым іншыя саюзныя рэспублікі.

Гэта, зразумела, дасягненьні не аднаго Дзяржпляну. Я падлічыў, што СНК ужо пяць раз разглядаў і абмяркоўваў пяцігодку, пяць раз СНК дэтальна вывучаў нашу работу. Потым мы правялі нашы матар'ялы праз XI зьезд КП(б)Б і зараз праз XII зьезд, атрымаўшы поўную ацэнку ўсіх матар'ялаў, атрымаўшы вычэрпваючую крытыку тых пытаньняў, якія закранаюцца ў пяцігодцы.

ПЛЯНЫ ЎДАСКАНАЛЕНЫ Ў БОК ДАЛЕЙШАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ

Якія зьмены ўнесьлі саюзныя органы ў нашы пляны? Наогул у нас разыходзін няма. Нашы паказчыкі—якасныя і колькасныя—прыняты, прычым, некаторыя прыняты літаральна, а некаторыя прыняты з такімі нязначнымі зьменамі, што нават супярэчыць ня прыходзіцца. Тыя разыходжаньні, якія ёсьць, не зьяўляюцца прынцыповымі ў сэнсе грашовым, або якасных установак, а толькі практычнага характару

Нашыя-ж уласныя папраўкі да першапачатковага варыянту ідуць пад кутом погляду далейшай рэканструкцыі розных галін народнай гаспадаркі, прычым, у кожным мерапрыемстве зложаны далейшыя патэнцыяльныя мажлівасьці. Мы кожны дзень выяўляем мажлівасьцяй значна больш, чым гэта намячаецца нашымі плянамі. Пры гэтым тыя лічбы, што ўнесены ў пяцігодку, зьяўляюцца ня голымі лічбамі, але за імі ідзе цэлая сыстэма мерапрыемстваў па сацыялістычным будаўніцтве.

Пэрспэктывы энэргетыкі і электрыфікацыі БССР
(Даклад тав. А. Каппана)

Энэргетыка—аснова ўсёй пяцігодкі.—Першае месца—торфу, асноўнаму віду нашых энэргетычных рэсурсаў.—Беларускія электрастанцыі будуць зьвязаны з саюзнымі станцыямі. — Як мы будзем вырашаць праблему сельскае электрыфікацыі

НАША ЭНЭРГЕТЫКА БАЗУЕЦЦА НА ТОРФЕ

У аснову ўсёй пяцігодкі пакладзен прынцып энэргетыкі. Аснова ўсяго нашага пляну—гэта жывая чалавечая праца, якую трэба арганізаваць і максымальна выкарыстаць для сацыялістычнага будаўніцтва. Сродкі для гэтага падвойныя: першае—узьняцьце якасьці гэтай працы, шлях паляпшэньня ведаў і паляпшэньня матар'яльнага і культурнага ўзроўню і, падругое — мэханічнае ўзбраеньне рабочых. Калі ў 1927-28 годзе энэргетычнае ўзброеньне аднаго рабочага (у цэнзавай прамысловасьці) у нас складала 0,7 кілёват, дык у канцы пяцігодкі гэты каэфіцыент павялічваецца да 1 з чвэрткай.

У нас у аснову разьвіцьця энэргетыкі пакладзены апалавыя рэсурсы, якія ў Беларусі пераважаюць над іншымі энэргетычнымі відамі (торф).

Калі ўдзельная вага торфу, які ўжываўся ў нас у прамысловасьці, на транспарце і электрастанцыях, зараз складае 4,7 проц., дык у канцы пяцігодкі яго ўдзельная вага вырастае да 35,7%.

ТОРФ—СЫРЭЦ ДЛЯ РОЗНАЙ ВЫТВОРЧАСЬЦІ

У пяцігодцы намячаецца таксама спажываньне торфу ў якасьці сырцу для розных відаў вытворчасьці, для падсьцілачнага матар'ялу, для ўгнаеньня, як будаўнічы матар'ял і як ізаляцыйны. Потым мы з торфу будзем выраблаць рознастайныя хэмічныя рэчы (фарбы), мы з торфу будзем вырабляць газ, вадарод і аўсяны ўгаленьні.

Удзельная вага дроў у нас значна памяншаецца—з 61 да 33 проц. Але гэта ня значыць, што агульная кольксьць ужываных дроў будзе меншая—толькі яны будуць ужывацца ня як апал пад катламі, а будуць скарыстоўвацца больш рацыянальна ў вытворчасьці для выпрацоўкі з іх розных вырабаў.

ПА ЯКІМ ПРЫНЦЫПЕ МЫ БУДЗЕМ БУДАВАЦЬ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ

Цяпер аб электрыфікацыі. Мы задаемся мэтаю будаваць такія электрастанцыі, якія будуць служыць ня толькі ўжо ёсьць, але і тых патрэб, якія могуць быць выяўлены ў сувязі з пабудовай новай станцыі. Электрастанцыя, сама па сабе пабудаваная, зьявіцца стымулам для разьвіцьця прамысловасьці, для разьвіцьця спажыўцоў, хоць зараз іх і ня бачым.

КАНЦЭНТРАЦЫЯ ВЫПРАЦОЎКІ ЭЛЕКТРАЭНЭРГІІ

Потым у аснову пяцігадовага пляну электрыфікацыі пакладзен прынцып канцэнтрацыі выпрацоўкі энэргіі. Даведзена, што больш выгодна і рэнтабэльна атрымліваць энэргію на буйных установках.

Мы на працягу пяці год, акрамя буйных раённых станцый, прадугледжваем будаваць станцыі агульнага карыстаньня (так званыя гарадзкія), а потым фабрычна-заводзкія і сельскія станцыі.

Ад таго, што мы канцэнтруем зладаваньне электраэнэргіі, мы эканомім алавы выдаткі на 40 проц., прычым мы атрымліваем меншыя выдаткі ня толькі на алову кілёват-гадзіну, але таксама на алавяную [illegible]

У [illegible] каэфіцыент эканомі[illegible] (30-90 проц.).

СУВЯЗЬ БЕЛАРУСКАЙ ЭЛЕКТРЫФІКАЦЫІ З САЮЗНАЙ

Але і гэтых 30-40 тысяч кілёват ня хопіць у канцы пяцігодкі. Гэта таму, што як мы лічым, ужываньне току з Асінаўскай станцыі будзе праводзіцца ня толькі ўнутры Беларусі, але і за яе межамі (Смаленская губ.). Пытаньне гэта

Сарваны пераход „Дняпроўскай мануфактуры“ на 7-гадзінны рабочы дзень

„Недарэчнасьць“ з заказам новага абсталяваньня і продажам старога

Абсьледваньне буйнейшай у Беларусі мануфактурнай фабрыкі «Дняпроўская мануфактура» (Аршанская акруга) членам бюро ЦК КП(б)Б тав. Бэйліным выявіла выключныя бясчынствы, у выніку якіх сарваны пераход гэтага прадпрыемства з 1-га красавіка на 7-гадзінны рабочы дзень і трохзьменную работу. Замест набору новых рабочых, фабрыка стала перад необходнасьцю скараціць частку наёмнага складу.

Да такіх сумных вынікаў прывялі «дзейнасьць» адміністрацыі, пастаянная сварка паміж ёю і фабкомам і пераэгаваньне на нездаровыя зьявы з боку бюро парткалектыву.

Заказаныя ў свой час 114 новых ткацкіх варштатаў савецкае вытворчасьці прыбылі яшчэ ў студзені гэтага году. Прыступіць, аднак, да іх устаноўкі нельга было, бо забыліся заказаць да іх некаторыя патрэбныя часткі.

Выкананьне заданьня аб пашырэньні фабрыкі, яе пераабсталяваньні і пераводзе на 7-гадзінны рабочы дзень адкладваецца з прычыны гэтага на неакрэсьлены час—у залежнасьці ад выкананьня данага зараз заказу на гэтыя часткі.

Пачынаючы з студзеня 114 новых варштатаў валяліся пад адкрытым небам на фабрычным дварэ, іржавелі і псаваліся. І толькі дзякуючы ініцыятыве саміх рабочых, якія не без паўставы баяліся, што драўляныя часткі варштатаў згніёць, апошнія былі зьняты з машын і зложаны ў склад.

Мяркуючы закончыць пераабсталяваньне да 1-га красавіка, адміністрацыя «Дняпроўскай мануфактуры» прадала старыя 140 варштатаў адной грузінскай фабрыцы па вырабе шоўку з абавязацельствам перадаць іх прыёмшчыкам гэтай фабрыкі не пазьней 1-га красавіка. Быў, зразумела, заключан адпаведны дагавор. Да гэтага моманту на «Дняпроўскую мануфактуру» і прыбылі прыёмшчыкі, якія дарма чакаюць варштатаў і да гэтага часу.

Перакананўшыся, што абсталяваньня ім не атрымаць, яны літаральна моляць паслаць з імі прадстаўнікоў фабрыкі, каб растлумачыць грузінскім рабочым усю гэту «недарэчнасьць». Між іншым пераабсталяваньне і пашырэньне фабрыкі ў Грузіі было адпаведна прыстасавана да 1-га красавіка.

ПАГРАЖАЮЧЫ ЗАНЯПАД ПРАЦДЫСЦЫПЛІНЫ НА ТРАНСПАРЦЕ

ДЗЕСЯТКІ ЗДАРЭНЬНЯЎ, СОТНІ ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ СТРАТ, ЧАЛАВЕЧЫЯ АХВЯРЫ--УСЁ ГЭТА ВЫНІК НЯДБАЙНАСЬЦІ І ЗАНЯПАДУ ПРАЦДЫСЦЫПЛІНЫ

ХТО Ў ГЭТЫМ ВІНАВАТЫ?

Агідныя факты, што мелі месца на транспарце, гавораць аб тым, што сярод часткі чыгуначнікаў працдысцыпліна моцна заняпала.

Паглядзім, што робіцца на трох больш буйных вузлох—Менскім, Віцебскім і Аршанскім.

На ст. Віцебск за першы квартал бягучага гаспадарчага году было 132 здарэньні па службе цягі і 52—па службе руху. У 24-х выпадках паравозы і вагоны сходзілі з рэек, наляталі на ўпоры, ляцелі па занятых шляхох і г. д, у выніку—вялікія шкоды. 75 проц. усіх выпадкаў прыпадае на спыненьні цягнікоў і разрывы, якія амаль поўнасьцю залежаць ад брыгад. Зарэгістравана таксама 6 няшчасных выпадкаў, вынікам якіх былі чалавечыя ахвяры. Асабліва шмат здарэньняў было ў лістападзе—па некалькі здарэньняў у дзень.

Ня лепш і на ст. Ворша, дзе на працягу 2-х месяцаў было 32 здарэньні. Вынік—страты ў 30.000 руб. і некалькі чалавечых ахвяр. Выпадкаў парушэньня правіл бясьпечнасьці было звыш 40.

Меў месца і такі факт. На ст. Ворша адбылася сутычка двух мануўручых паравозаў. Выявілася, што машыністыя гэтых паравозаў напярэдадні пасварыліся, а ў часе манэўраў не пажадалі саступіць адзін аднаму з дарогі.

Пяройдзем да ст. Менск, Даяжурны на станцыі і ст. стрэлачнік нядаўна пусьцілі цягнік № 55 на.. дрывяны склад: няправільна перавялі стрэлку.

Пры праверцы пастоў выявілася, што стрэлачнікі часта сьпяць. Вагаўшчыкі разам з вартаўнікамі п'янствуюць на службе і г. д. Можна падаць яшчэ дзесяткі абураючых фактаў заняпаду працоўнай дысцыпліны.

Чым-жа выклікана такое пагражаючае становішча? У першую чаргу вінаваты парт'ячэйкі і прафарганізацыі, якія за апошні час займаліся якімі хочаце пытаньнямі, толькі не працдысцыплінай. Нізавая адміністрацыя адносіцца да парушэньняў працдысцыпліны нядбайна.

— Мы не жадаем, каб нас валачылі мясцкомах, ці каб рабочыя кідалі цэглінамі,—гавораць некаторыя.

Прафарганізацыі часта бяруць пад сваю абарону людзей, за якімі лічыцца да 10 парушэньняў працдысцыпліны (выпадак у Віцебску). Такіх фактаў шмат.

ЦЭМКІН.

Менскі вузёл---у хвасьце

Адозва 3-га пленуму ЦК саюзу чыгуначнікаў да ўсіх рабочых транспарту з заклікам узьняць прадукцыйнасьць працы і ўмацаваць працоўную дысцыпліну ўзварушыла грамадзкую ўвагу.

Правядзеньне сходаў па мясцкомах, нарада актыву гаспадарнікаў і прафработнікаў, сход рабочых—усе выказалі аднадушнае жаданьне павесьці барацьбу з прагуламі, п'янствам, расхлябанасьцю і іншымі балячкамі, якія перашкаджаюць у нашай рабоце.

Каб замацаваць і прапягнуць гэтую работу, Менскі вучпрафсож намеціў рад мерапрыемстваў: нараду моладзі, сход прагульшчыкаў, асьвятленьня гэтага пытаньня ў насьценгазэтах, прапрацоўку гэтых пытаньняў у клюбах і чырвоных куткох, выклік на спаборніцтвы іншых вузлоў і майстэрань і г. д.

Але, на жаль, усё гэта засталося толькі на паперы.

Мінула ўжо тры тыдні пасьля апошняга сходу рабочых, а аб далейшых кроках вучпрафсожу няма ніякіх чутак.

У апошнія дні «Гудок» і «Транспортная газета» падрукавалі адозву НКШЗ, ЦК чыг. і ЦК УсеЛКСМ да ўсіх чыгуначных арганізацый аб правядзеньні сацыялістычнага спаборніцтва на транспарце.

Здавалася, што гэта павінна паслужыць штуршком. У адозве яшчэ гаворыцца аб максымальнай дапамозе гэтаму спаборніцтву. Працаўнікі культадзелу вучпрафсожу гэтую дапамогу разумеюць і выконваюць ня так, як гэта павінна быць. Карэспандэнт мясцовай газэты, які зьвярнуўся да заг. культадзелу вучпрафсожу, атрымаў такі адказ: «нічога ня ведаю і нічога ня чуў пра гэта. Сходзеце да заг. клюбам тав. Крэсіка, ён працуе сярод моладзі, ён, можа быць, ведае».

Камэнтары лішня.

Камсамольскія ячэйкі на вузьле таксама не сьпяшаюцца. Іх удзелу ў абгаварэньні пытаньня аб працдысцыпліне амаль ня было, а між тым факты гавораць, што і сярод моладзі з працдысцыплінай ня ўсё добра. Яшчэ ў памяці выпадак адмаўленьня ад работы брыгады, у якой былі ўсе камсамольцы. Яшчэ ня зьнішчаны хваробы школы вучнёўства, дзе нядаўна абсьледваньне выкрыла п'янства, разлажэньне, мяжуючае са злачынствам, адсутнасьць якой-небудзь дысцыпліны і г. д. Усё гэта гаворыць за тое, што і тут непачаты край работы.

А калі да ўсяго сказанага дадаць, што сабекошт рамонту на 4-м вуч. цягі мае тэндэнцыю да павышэньня, а выкананьне праграмы рамонту па некаторых цэхах зьніжаецца, дык вывад паўстае сумны.

Менскі вузел пляцецца ў хвасьце.

А.

Аднымі вымовамі мэты не дасягнеш

(Станцыя Віцебск)

Цікавыя паказальнікі слабасьці працоўнай дысцыпліны сярод рабочых і служачых ст. Віцебск. Адміністрацыяй за 4 месяцы, пачынаючы з кастрычніка, на рабочых і служачых наложана вялікая колькасьць спагнаньняў. Так, вымовы атрымала 97 чалавек, «па від»—16 і заўвагі—59 чал.

За якія ўчынкі? За няяўку на службу—13 ч., за прыход на работу п'янымі—7 чал. і за нядбайныя адносіны да работы—107 чал.

Гэтыя лічбы навочна паказваюць, што працоўную дысцыпліну на Віцебскім вузьле трэба ўзьняць на адпаведную вышыню. Тут толькі вымовамі і заўвагамі мэты не дасягнеш. Партарганізацыя разам з саюзам і камсамолам павінна неадкладна ўзяцца за практычную барацьбу супроць выпадкаў парушэньня працоўнай дысцыпліны, супроць нядбайных адносін да сваіх абавязкаў.

РАБКОР С.

Рашуча ўдарыць па нядбайнасьці

(2-е аддзяленьне эксплёатацыі МББ чыгункі)

Пытаньне аб працоўнай дысцыпліне на транспарце трэба паставіць у цэнтры ўвагі ўсіх рабочых чыгуначнікаў. Чыгуначнікі не павінны адстаць ад рабочых фабрык і заводаў у справе ўздыму працдысцыпліны. Аб тым, што ў гэтых адносінах у нас ня ўсё добра, сьведчыць рад канкрэтных прыкладаў.

Вось узяць, напрыклад, нашае аддзяленьне эксплёатацыі МББ чыгункі. Тут, пачынаючы з 1-га студзеня г. г., было 23 выпадкі нядбайных адносін да работы, парушэньняў правіл на перавозцы грузаў. За гэты пэрыяд зарэгістраваны прагулы па нягрунтоўных прычынах—два выпадкі да 3 дзён і адзін выпадак, калі служачы ня прыходзіў на работу больш як тры дні.

А кожны выпадак нядбайных адносін да сваіх абавязкаў выклікае здарэньні, якія дорага каштуюць дзяржаве, якія часамі цягнуць за сабой і чалавечыя ахвяры.

Трэба рашуча ўдарыць па прагульшчыках і тых, хто нядбайна адносіцца да сваіх абавязкаў. А гэта справа чыгуначнікаў саміх у першую чаргу.

Н. К—д.

Прагулы зьменшыліся, але...

(8-мы вучастак пуці, МББ чыгункі)

Па нашым вучастку ў лютым м-цы г. г. п раўнальна з кастрычнікам 1928 г. колькасьць прагулаў зьменшылася амаль у 4 разы. Аднак яшчэ гэта адмоўнае зьявішча мае сваё месца асабліва па 81, 82, і 83 акалодках.

Што-ж рабілася ў справе барацьбы з прагуламі? Апрача таго, што з боку адміністрацыі накладаліся рознага роду спагнаньні, не рабілася нічога. П'янства яшчэ мае месца на вучастку. За апошні пэрыяд былі тры выпадкі прыходу на работу ў нецьвярозым стане.

Тут з усёй навочнасьцю выяўляецца тое, што прафарганізацыя не вядзе абсалютна ніякай работы па ўздыме працоўнай дысцыпліны. Нават больш таго. Групком будаўнікоў часамі патурае нездаровым тэндэнцыям адсталых рабочых. Так, справа наконт расцэнак на рубку сьцен аднаго будынку была саюзам даведзена да арбітражнай камісіі, якая прызнала вымаганьні рабочых нездаровымі. Вельмі дрэнна в працоўнай дысцыпліне у чорнарабочых з біржы працы.

У адносінах лінейных мясцкомаў трэба чакаць лепшай работы па барацьбе з п'янствам, якое наглядаецца па некаторых акалодках

Г. Д.

Тысячы рабочых гадзін на чаргу за атрыманьнем пэнсіі

Яшчэ да сучаснага моманту на чыгуначным транспарце зарплата выдаецца ў рабочы час. Мэтад застаецца стары: «станавіся ў чаргу» і... стой гадзіну. І добра, калі гадзіну, а то прыходзіцца часам стаяць і больш. Колькі тысяч гадзін трацяцца непрадукцыйна? Падлічым.

На адным толькі 4-м вучастку ст. Менск, дзе выдача зарплаты робіцца два разы ў месяц, кожны рабочы ў сярэднім траціць адну гадзіну. Выходзячы з таго, што ўсіх рабочых на вучастку занята 1.200 чал., а стаяць у чарзе прыходзіцца 2 разы ў месяц, такім чынам, у месяц траціцца: 2×1.200 =2.400 гадзін. Калі прыняць пад увагу, што на рамонт вагону траціцца 150 гадзін, дык стане ясным, што за час, патрачаны на чаргу за атрыманьнем пэнсіі, можна было-б адрамантаваць 16 вагонаў у месяц ці 192 вагоны ў год. І гэта толькі па адным вучастку!

Запытаньне: колькі вагонаў можна было-б адрамантаваць па ўсёй Беларусі за час, які дарэмна траціцца на чаргу за атрыманьнем пэнсіі?

Мы лічым, што пытаньне аб тэнхіцы выдачы зарплаты на транспарце даўно насьпела і яго трэба вырашыць. Ці шляхам канвэртнай сыстэмы, ці праз ашчадныя касы, але трэба вырашыць у самы бліжэйшы час.

К.

Сацыялістычнае спаборніцтва на чыгунцы

Першым ідзе цэх па рамонце таварных вагонаў

Пры Менскім, Віцебскім і Аршанскім вучпрафсожам утвораны тройкі садзейнічаньня сацыялістычнаму спаборніцтву.

У Менску на вучастку цягі арганізаваны тры ўдарныя рабочыя брыгады моладзі, якія зрабілі ўжо прыкметны ўплыў на ўзьняцьце ў майстэрнях працоўнай дысцыпліны.

Моладзь менскіх майстэрань выклікала на сацыялістычнае спаборніцтва Гомельскія галоўныя майстэрні.

Адначасова на вучастку цягі МББ чыг. разгортваецца конкурс на лепшы цэх, абвешчаны вытворчай камісіяй. Першым у конкурсе ідзе цэх па рамонце таварных вагонаў. У гэтым цэху зьнішчаны прастої і поўнасьцю нагружаны рабочы дзень. Так, раней вагоны знаходзіліся ўрамонце ад 6 да 7 дзён, цяпер 3½—4 дні. Вытворчая праграма майстэрань па канвэнцыйным рамонце вагонаў значна павялічана.

Тав. Амосаў—аб задачах сацыялістычнага спаборніцтва

Старшыня ЦК саюзу чыгуначнікаў СССР тав. Амосаў наступным чынам ахарактарызаваў задачы сацыялістычнага спаборніцтва па транспарце.

— Сацыялістычнае спаборніцтва павінна быць разгорнута сярод самых шырокіх мас рабочых і ў прыватнасьці сярод чыгуначнікаў.

Трэба, каб кожная брыгада рабочых, майстэрняў, дэпо, мапыністых, рабочых службы шляху паставіла сваёй штодзённай задачай наладзіць самы ўважлівы нагляд як за сваёй работай, так і за работай сваіх таварышоў Трэба імкнуцца, каб прынцыпы работы былі пабудаваны па пагаворцы: «Рабочая капейка бяражэ савецкі рубель».

Трэба так павесьці спаборніцтва, каб да 1-га мая былі ўжо атрыманы практычныя дасягненьні.

Майстэрні павінны ўступіць у спаборніцтва з майстэрнямі, станцыі—са станцыямі, вучасткі—з вучасткамі, дарогі—з дарогамі. З другога боку, транспартнікі павінны ўступіць у спаборніцтва з рабочымі прамысловасьці на лепшае выкананьне ўстаноўленых для іх прадпрыемствам норм і праграм работы.

Саюз чыгуначнікаў павінен удзяляць у гэту работу клюбы, чырвоныя куткі, вытворчыя нарады і самыя шырокія масы рабочых.

Усе словы адносна спаборніцтва ўжо сказаны; цяпер справа за практычнай дружнай работай і арганізацыяй праверкі выкананьня.

Ніводнага прагулу і спазьненьня!

Хто прымае выклік рабочых лесазаводу „Калектыўная Праца“?

Група камсамольцаў, партыйцаў, працуючых на канцарэзцы стружачнага цэху лесазаводу «Калектыўная Праца» (Гомельскае акругі) абвясьціла сацыялістычнае спаборніцтва ў сваім аддзяленьні. Задача спаборніцтва—100 процантная якасьць і 200 процантаў агульнай выпрацоўкі.

Ні хвіліны прастою на віне рабочага! Варштаты працуюць ад гудка да гудка (а раней іх спынялі за 20 хвілін да гудка). Поўнае скарыстаньне драўніны. Ніводнага выпадку прагулу і спазьненьня на работу!

Спаборніцтвы вядзе цэх з цэхам, варштат з варштатам. Рабочыя стружачнага цэху прынялі выклік групы камсамольцаў і 5 красавіка стары рабочы тав. Каўбасьнікаў даў 190 проц. агульнай выпрацоўкі. За ім ідзе рабочы Варушчанка. Астатнія варштатныя таксама не адстаюць.

6 красавіка былі несвачасова паданы дровы на канцарэзку, з-за чаго прыпынілася стаяць паўгадзіны.

Па даручэньні стружачнага цэху выклікаем качагараў даваць усю запасную пару сушыльні, каб своечасова высыхаў сырэц. Тачальшчыкі під павіны лепш вастрыць пілы.

Рабочыя стружачнага цэху прапануюць банчарнаму, лесапільнаму, скрыначнаму цэхам і стружачнаму аддзяленьню лесазаводу імя Тэмскага пасьледаваць іх прыкладу.

Усе на спаборніцтва!

Ф—ў.

Як працуе беларускі аграном

ЦЯКУЧАСЬЦЬ АГРАНАМІЧНАГА ПЭРСАНАЛУ.—НЕДАПУШЧАЛЬНЫЯ АДНОСІНЫ РАЁННЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ ДА РАБОТЫ АГРАНОМАЎ. АГРАНОМЫ ВЯДУЦЬ РАБОТУ І ПРЫМАЮЦЬ НАВЕДВАЛЬНІКАЎ У КАЛІДОРЫ. КАПАТКЕВІЦКІ РВК ЗАХАПІЎ ПАМЯШКАНЬНЕ АГРАПУНКТУ

Ці знаходзіцца аграном у першых радах пасеўнага фронту?

У масе сваёй бязумоўна так. Аб гэтым сьведчаць даныя з месц і абсьледваньні ходу падрыхтоўкі да сяўбы на розных акругах Беларусі.

Гэта ня значыць, аднак, што з агранаслугоўваньнем у нас абстаіць вельмі добра.

Па сутнасьці, мала вызваліць агранома ад канцылярскіх абавязкаў. Трэба яшчэ стварыць адпаведныя ўмовы для яго работы, трэба зрабіць так, каб ён мог бываць у вёсцы. А аб адсутнасьці гэтых умоў і нежаданьні іх стварыць крычаць аграномы з раду месц Беларусі.

Узяць хаця б для прыкладу Мазырскую акругу. Замест 47 аграномаў на штаце на 15-га сакавіка там налічвалася толькі 37, з якіх 11 чалавек паступіла ў лютым. Што-ж датычыць іншых 25 аграномаў, дык яны працуюць у Мазырскай акрузе ад паўгода да году.

Такой цякучасьцю агрэпэрсаналу асабліва адзначаецца Мазырская акруга, але гэта зьявішча мае месца і па іншых акругах «Цякучыя» месцы, як правіла запаўняюцца зялёнай моладзьдзю, якая толькі скончыла ВНУ. Тлумачыцца гэта тым, што для маладых аграномаў няма іншых месц. Але варта такому маладому аграному пабыць на практыцы паўгода або год, як ён сьпяшаецца ўцякаць у другое месца.

Дзе прычыны слабога ўкамплектаваньня агранамічнай сеткі раду раёнаў і ўцяканьня.

Недаволенасьць матар'яльным становішчам (пам аграномы атрымліваюць 85 руб., аграномы—100 руб пэнсіі), аказваецца, ня грае рашаючай ролі. Нарэшце, агранамічны пэрсанал усюды атрымлівае адпаўкавую стаўку.

Некаторае ўяўленьне аб прычынах уцяканьня дае наступная размова паміж аграномам і адным з старшынь РВК.

— Я колькі раз прасіў вас даць мне каня для паездкі ў вёску. Не давалі, я ішоў пехатою. Дайце каня хоць на гэты раз.

— Ідзеце вы к чорту з вашымі коньмі.

Аграномы гавораць, што толькі цяжкія ўмовы работы што ствараюцца РВК, прымушаюць іх гандляваць з аднаго месца ў другое. І сапраўды, уцяканьне мае месца іменна там, дзе аграномам не даюць сродкаў для праездаў, дзе РВК зусім ня ідуць насустрач агрэпэрсаналу. І сапраўды, ня можа-ж аграном пакрыць выдаткі па паездках з тых 9 руб. у месяц, якія яму дае РВК для гэтай мэты. Ня можа-ж аграном купіць сабе кажушок, валёнкі і дажджавы плашч за тыя 5 руб. у год, якія яму адпускаюцца в мясцовага бюджэту на спэцвопратку

Апраўданьні некаторых РВК, што больш тых сродкаў, якія даюцца на гэта з мясцовага бюджэту, яны даць ня могуць, не зьяўляюцца грунтоўнымі. Гэта пацьвярджаецца існуючым становішчам у радзе раёнаў Гомельскае акругі, дзе цякучасьць агрэпэрсаналу значна меншая, чым, напрыклад, у Мазырскай. У Гомельшчыне РВК неяк ўмудріліся ўсё-ж такі выкраіць для сваіх аграномаў грошы на спэцвопратку, далі і коняй для паездак і дапамагаюць у рабоце.

Наколькі нядбайна некаторыя РВК яшчэ адносяцца да работы агрэпэрсаналу, сьведчыць наступны факт. У Калінкавіцкім РВК для раённай зямельнай часткі адведзены невялікі пакойчык у 6 кв. саж. Тут акрамя апарату зямельнай часткі і аграномаў зьмяшчаюцца: ЗАГС, культасьвет і зямельны суд. У гэтым-жа пакойчыку знаходзіцца і тэрмастат для спробы насеньня. Пры такіх умовах ня можа быць і гутаркі аб рацыянальнай рабоце агранома, які складае пляны пасеўнай кампаніі, займаецца дасьледваньнем пасеўнага матар'ялу і г. д. Да рэчы, калі зямельны суд склікае нарады, усіх работнікаў, што знаходзяцца ў пакоі, выганяюць у калідор. Тут у калідоры і прыходзіцца аграному прымаць наведвальнікаў і складаць пляны.

У Мазырскай акрузе ліквідавалі існаваўшыя аграпункты. Петрыкаўскі РВК заняў памяшканьне аграпункту і потым перадаў яго міліцыі. У Капаткевіцкім раёне былі адпушчаны спэцыяльныя сродкі 15.000 руб. на пабудову аграпункту. Калі аграпункт быў пабудаваны, РВК захапіў усё памяшканьне для сябе.

Прыходзіцца зьдзіўляцца, як пры такіх умовах беларускія аграномы ў масе оваёй былі на належнай вышыні.

У самыя марозныя дні лётка апрануты аграном ішоў у вёску, каб наладзіць падрыхтоўку да сяўбы, каб прасачыць, як праводзіцца ачыстка насеньня Беларускі аграном усё-ж выконвае работу па калектывізацыі, вытворчым каапэраваньні. Ён арганізоўвае курсы для сялян, кіруе гэтымі курсамі.

Да пачатку сяўбы засталося мала часу. Аграномам трэба залажыць рад паказальных вучасткаў на сялянскай зямлі. Яны павінны ажыцьцявіць пераход на шматпольле. Трэба хоць цяпер стварыць больш спрыяючыя ўмовы работы для агранамічнага пэрсаналу.

Нарэшце, РВК павінны вразумець, што да гэтага часу, пакуль аграномы ў іх будуць у ролі пасынкаў, ім ня справіцца з задачай павышэньня ўраджайнасьці ў сваім раёне.

В.

Напярэдадні сяўбы

Чыгуначнікі Беларусі дапамагаюць сялянству

Чыгуначнікі Беларусі прымаюць актыўны ўдзел у паходзе за ўраджай і ў практычнай дапамозе вёсцы. Чыгуначнікі менскага вузла пастанавілі арганізаваць некалькі нязьельнікаў, а на сродкі за звышнормавую работу набыць для падшэфных вёсак с.-г. літаратуру, племянную жывёлу і с.-г. інвэнтар. Менскія чыгуначнікі арганізавалі дзьве перасовачныя майстэрні ў вагонах, якія ўжо выехалі ў раёны і прыступілі да рамонту с.-г. інвэнтару. Такія ж вагоны-майстэрні арганізаваны і ў Гомелі. У Магілеве, Жлобіне і Полацку арганізаваны рамонтныя брыгады чыгуначнікаў, якія таксама прыступілі да рамонту сялянскага с.-г. інвэнтару. Школы фабзавучу прыступілі да вырабу з жалезнага лому лемяшоў і адвалаў. У радзе месц арганізаваны збор драўніннага попелу шляхам устаноўкі спэцыяльных скрынь.

Чыгуначн кі Жлобінскага вузла адлічылі для дапамогі сялянству адзін процант свайго заработку.

30 сакавіка на сходзе чыгуначнікаў Жлобінскага вузла, дзе прысутнічала каля 1.000 чалавек, пастаноўлена ўзяць шэфства над калгасам імя 11-ай гадавіны Кастрычніка. Рэзалюцыі, усе сабраныя сродкі скарыстаць на патрэбы калектыву. У тойжа дзень на вёску накіравана рабочая брыгада, якая ўжо рамэнтуе інвэнтар. Для патрэб калгасу закуплена 10 папярочных піл, 10 сякер і інш. дробны інструмант. У бліжэйшы час пасылаецца яшчэ адна брыгада для правядзеньня культурнай работы. На сабраныя сродкі вучпрафсож набывае трактар, які дасьць магчымасьць сапраўды ўзмацніць сацыялістычную гаспадарку, а таксама ўзьняць агульнапалітычнае становішча калгасаў.

Арганізацыя буйных калгасаў на Гомельшчыне

Тэмп калектывізацыі на Гомельшчыне ў гэтым годзе ня толькі значна разгарнуўся, але набыў больш глыбокія формы.

На 1-га сакавіка г. г. па акрузе арганізаваны 32 новыя калгасы з лікам сем'яў 607, на агульнай плошчы каля 7.300 гэктараў.

З гэтых калгасаў 20 арганізавана на плошчы ад 20 да 400 гэктараў. Апрача таго, у Хойніцкім раёне ў вёсцы Арэвічы арганізаваны буйны калгас на плошчы 1.000 гэктараў.

Таксама падрыхтоўваецца да арганізацыі шмат калгасаў на плошчы да 500 гэктараў і больш.

У плян зямляўпарадкаваньня ўключаны 34 арганізаваныя калгасы.

Галоўным недахопам нашага калгаснага будаўніцтва да апошняга часу зьяўляецца вялікая колькасьць дробных, карлікавых калгасаў.

Так, з 48 калгасаў—17 калгасаў в агульнай плошчы усіх ужыткаў да 100 гэктараў, 22 калгасы—звыш 100 гэктараў, 7—да 300 гэктараў і звыш 300 гэктараў толькі 2 Таму Гомельскі акркалгасасаюз вядзе зараз належную работу па ўзбуйненьні існуючых калгасаў.

Узбуйненьне вядзецца, галоўным чынам, за кошт далучэньня да калгасаў сялянскіх гаспадарак вакольных сёлкаў і вёсак.

У гэтым кірунку ўжо ёсьць значныя дасягненьні: так, сельска-гаспадарчая арцель «Батрак» (Гомельская раёну) далучыла да сябе 47 сем'яў з бядняцкай вёскі «Жаробнае» і навялічыла сваю плошчу на 500 гэктараў. Да сельска-гаспадарчай арцелі «Селянін» далучаецца пасёлак з 20 гаспадарак на 160 гэктар, зямлі. Сельска-гаспадарчая арцель «Парастак Сацыялізму» (Рэчыцкага раёну) павялічвае на 15 сем'яў і 150 гэктараў зямлі. «Дняпроўская» камуна (Лоеўскага раёну) павялічыцца ў два разы, далучыўшы 50 гаспадарак і 500 гэктараў зямлі.

Таксама ўзбуйняюцца і іншыя калгасы акругі.

У выніку гэтых мерапрыемстваў сярэдні разьмер калгасаў у акрузе павялічваецца з 137 да 243 гэктараў.

У тых раёнах, дзе ёсьць густая сетка калгасаў, вядзецца работа па ўзбуйненьні гэтых калгасаў шляхам арганізацыі іх куставых аб'яднаньняў.

У Брагінскім раёне з 4-х калгасаў арганізаваўся куст імя 10-годзьдзя абвяшчэньня БССР.

Усяго ў гэтым годзе будуць арганізаваны ў Гомельскай акрузе 4 куставыя аб'яднаньні калгасаў.

Аграном КУДЗІНАЎ.

З пасеўнага фронту

Пра што пішуць селькорыі рабкоры

У сельсавеце ёсьць 140 бядняцкіх гаспадарак, якія будуць забясьпечаны насеньнем цалкам. Камітэт узаемадапамогі даў для іх 860 пудоў насеньня і сельска-гаспада,чая каапэрацыя 1.500 пудоў, пераважна аўсу, ячменю і ільну Дрэнна забясьпечаны насеньнічкі насеньнем капушыны, сэрадэлы, гародніны і інш. культурных траў. Мала загатоўлена бульбы.

У сельсавет прыехала рабочая брыгада будаўнікоў, якая арганізавала кузьню і пачала рамантаваць сялянскія прылады.

СІДАРОВІЧ.

ІНСТРУКСЫ І АБ ПРАТРУЧВАНЬНІ ПРЫСЛАЛІ, А АБ ФАРМАЛІНЕ ЗАБЫЛІ

Хаця падрыхтоўчая работа да веснавой пасеўнай кампаніі пачалася ў Рэчыцкім раёне своячасова, усё-ж па дырэктывах ураду амаль нічога ня зроблена ў сельскай гаспадарцы.

Па раёне ўжо ачышчана 65 проц. насеньня і намечана арганізаваць 8 буйных калгасаў, затое вельмі мала зроблена, каб забясьпечыць сялянства насеньнем, крэдытаваць беднату, спагнаць насенныя пазычкі. Амаль нічога не зроблена ў галіне загатоўкі мінэральных угнаеньняў і збору попелу.

Аб пратручваньні фармалінам насеньня разасланы інструкцыйныя лісты па ўсіх сельсаветах, партыйных і камсамольскіх ячэйках і г. д., а фармаліну няма. Ёсьць небясьпека, што ён своячасова не паладзе ў Рэчыцу.

Б—і.

БЕДНАТА БУДЗЕ ЗАБЯСЬПЕЧАНА НАСЕНЬНЕМ

Падрыхтоўка да сяўбы ў Верхмінскім сельсавеце, Менскай акругі, праходзіць пад лёзунгам—«Усё насеньне павінна быць ачышчанае і адборнае», «ніводнага дзірвана не павінна застацца без засеву». Абозы па ачыстцы насеньня працуюць в поўнай нагрузкай, прапускаючы праз машыны да 200 і больш пудоў у дзень.

„ПАШЛІ ВЫ К ЧОРТУ З ВАШЫМ ПОПЕЛАМ“

У Зэмбінскім сельскім і местачковым савеце сабрана 1.500 пудоў попелу, ачышчана і прасартавана 5.000 пудоў насеньня. З іх сельска-гаспадарчым таварыствам ачышчана 950 пудоў, сельсаветам—4.000 пудоў і местачковым саветам—150 пудоў. Ачыстка насеньня ўжо падыходзіць к канцу. Попел сабралі пераважна вёскі—1.500 пудоў. На мястэчка прыпадае ўсяго 200 пудоў, ня гледзячы на тое, што тут ёсьць шмат устаноў: камбінат, лазьня, больніца, дзьве школы і г. д. Тлумачыцца гэта тым, што некаторыя установы кенска адносяцца да збору попелу. Калі ў дырэктара камбіната запыталіся, чаму ён ня зьбірае попелу, дык ён адказаў: «пашлі вы к чорту з вашым попелам, у мяне справы больш важныя».

С. РУСАК.

Кармавая праблема на Беларусі

ЧАМУ У НАС НІЗКАРОСЛАЯ, ХУДАЯ ЖЫВЁЛА. ГАЛОЎНЫ НЕДАХОП НАШЫХ КАРМОЎ. ТЭХНІКА—НА ДАПАМОГУ СЯЛЯНСТВУ. 5 КАПЕЕК НА ЖЫВЁЛУ Ў ДЗЕНЬ

Кармовая праблема на Беларусі зьяўняў, бо ад правільнага вырашэньня яе ляцела адным з адказьнейшых пытаньняжыцьцёвасьці разьвіцьцё як непасрэдна жывёлагадоўлі і птушніцтва, так і агулам разьвіцьцё сельскае гаспадаркі.

Сучасны стан нашай жывёлагадоўлі, калі мы маем нізкарослую, худую, немалочную жывёлу стаўся таму, што ў нашых звычайных кармох не хапае цэлага раду спажыўных матэрый, без чаго нармальнае разьвіцьцё жывёлы немагчыма.

Галоўны недахоп нашых кармоў—гэта малы лік фосфару і пратэіну (азоцісто-бялковых злучэньняў).

Гэтыя дадаткі да звычайных кармоў амаль немагчыма здабыць у сельскай вясковай гаспадарцы, іх зможа даць толькі завод.

Другім алмоўным бокам у справе кармоў зьяўляецца іх няроўнамернае паступленьне ў гаспадарку. У той час, як увосень кармоў ёсьць шмат, пад вясну наадварот адчуваецца іх недахват. У гэтай справе на даламогу сялянству павінна прыйсьці тэхніка.

У парадку дня ставіцца пытаньне аб пабудове спэцыяльных заводаў па вырабе кармоў.

Апрача звычайна ўжываных кармоў трэба ўвесьці фосфарную спэцыяльна апрацаваную касьцяную муку і кармавыя растворы (дрожджы).

Ужываньне касьцяной мукі для ўмацаваньня касьцяка ўжывалася ў паасобных гаспадарках нават да вайны.

Так, па сьведчаньні маскоўскага праф. Жадіна, гэту муку дадавалі ў кармы для коняй вядомыя конназаводчыкі Арлоўскай губ.

Я сам быў сьведкай добрых вынікаў пры адкорме гэтай мукой птаства.—Павялічваўся рост, менш здыхала маладняку і была лепшая носка яек.

Быўшы дырэктар Пакроўскага касьцяновага заводу інж. Шэр сьведчыць, што кожны год Пакроўскім заводам адпраўлялася на Беларусь некалькі вагонаў касьцяной мукі спэцыяльна для вырабу кармоў да корму.

Па словах вядомага спэцыяліста праф. Кельнара, сутачная прымешка гэтай мукі на жывёлу на 100 кілё вагі 15 грам. Для цельных і дойных кароў сутачная прымешка павялічваецца ў паўтара-два разы.

Сутачная прымешка кармовага раствору (дрожджаў) на 100 кілёграмаў вагі жывёлы складае 60 грам.

Мы бачым, што для нармальнага разьвіцьця жывёлы патрэбны зусім не вялікія лічбы дадатковых кармоў. Коштгэтых дадаткаў складае 3-5 кап. на жывёлу ў дзень.

Але ўся справа ў тым, што гэтых маленькіх лічбаў, асабліва патрэбных жывёле ў зімовую пару для чалавечага цяплыні свайго цела, яна не дастае ў звычайных зімовых кармох і таму мізарнае і слабое настолькі, што пад вясну ледзь ходзіць.

Плянуючы разгортваньне жывёлагадоўлі, трэба разам з гэтым уздымаць працу аб кармох.

Часткова кармавая справа вырашаецца сіласаваньнем. Сіласаваныя кармы можна значна палепшыць, дадаючы да іх пэўны процант касьцяной мукі.

Але сіласаваньне гэта толькі часткавае вырашэньне кармовай праблемы—сіласаваньне больш рацыянальна выкарыстоўвае адходы сельскае гаспадаркі.

Трэба плянова выкарыстоўваць для кармоў і адходы прамысловасьці.

Нарэшце трэба, карыстаючыся кармовымі рэсурсамі сельскай гаспадаркі і прамысловасьці, распрацаваць адпаведную для кожнага раёну жывёлагадоўлі спэцыяльную рэцэптуру кармоў, адпавядаючую патрабаваньням рознай жывёлы. Гэтыя кармы фабрычным шляхам выраблюць для жывёлы так, як цяпер гэта робіцца для чалавека.

Было-б вельмі пажадана, каб гэтым пытаньнем зацікавіліся навны дасьледчыя станцыі на жывёлагадоўлі.

Спэцыяльныя вынікі гэтай працы адлеюць значна палепшыць умовы жывёлагадоўлі, асабліва ў саўгасах і калгасах.

Інжынер Ганеўскі.

Выгнаць чужы элемэнт з рабочай каапэрацыі

Посьпехі спажывецкай каапэрацыі нямінуча цягнуць за сабою выцясьненьне прыватна-капіталістычных элемэнтаў гораду і вёскі, нямінуча прыводзяць да больш узмоцненага наступленьня сацыялістычнага сэктару гаспадаркі на гандляра, нэпмана, спэкулянта, кулака і ліхвяра.

Пасьпяхов

ПРАЛЕТАРЫ ЎСЕХ КРАЎЎ, ЛУЧАЙЦЕСЯ!

„ЗЬВЯЗДА“

Штодзённая грамадска-палітычная і прафэсіянальна-тэхнічная газета ЦК КП(б)Б і Менскага акружнога камітэту КП(б)Б

Выходзіць з 1-га лютага 1924 г. Выходзіць у Менску

Адрэс рэдакцыі і канторы: Менск, Савецкая, 63 (трэці паверх)

Тэлефоны: Гал. кантора № 7-81; Рэдактар № 10-74; Сакратар № 6-19; Партаддзел № 13-80; Аддзелы замежнай і ўнутранай інфармацыі № 13-80; Начны рэдактар № 6-42

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ

Прывітаньне рабселькораў

Шчырае прывітаньне органу ЦК КП(б)Б газэце «Зьвязда» ад III акружнай нарады рабселькораў Полаччыны.

Полацкія рабселькорыя расьце і ўзмацняецца, ня гледзячы на шматарныя труднасьці, усё больш загартоўваецца ў барацьбе за лепшую будучыню.

Пры дапамозе партыйнага друку полацкая рабселькорыя будзе ў далейшым аддана всьцю працу на карысьць пралетарыяту і выконваць задачы камуністычнай партыі і савецкай улады.

Прэзыдыум нарады.

Чыстка і насьценгазэты

З абсьледваньня раду насьценгазэт відаць, што кампанія чысткі партыі і савецкага апарату рэдакцыямі яшчэ не распачата, а калі дзе і ёсьць адна-дзьве заметкі, то яны маюць галоўным чынам фармальны характар. Заметкі практычнага зьместу ў насьценгазэтах амаль што адсутнічаюць.

Гэтым артыкулам мы хочам даць некаторыя ўказаньні рэдакцыям, як пачаць і разгарнуць асьвятленьне пытаньняў чысткі ў насьценгазэтах.

На арганізацыю кампаніі рэдакцыі павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу, бо ад арганізацыі залежыць посьпех удзелу насьценгазэт у правядзеньні чысткі партыі і апарату ад сапраўды чужых і шкодных нам людзей. Пачынаць трэба са сходу рабселькораў прадпрыемства або вёскі, на якіх паставіць даклад аб чыстцы партыі і апарату з тэй нагоды, каб пасьля сходу рабселькоры пачалі зараз-жа даваць матар'ял у насьценгазэту аб бюракратах, злачынцах, камуністых, што раздажыліся, і г. д.

Рэдакцыя павінна растлумачыць на рабселькораўскім сходзе задачы чысткі і каго мы будзем чысьціць і пра каго мы павінны пісаць). Падрабязна аб чыстцы чытайце даклад т. Калініна ў газ. «Зьвязда», № 57. Рэдакцыі павінны даць указаньні рабселькорам, якія артыкулы і газэты чытаць па пытаньнях чысткі з тэй мэтай, каб рабселькоры добра разьбіраліся, пішучы матар'ял да чысткі. Карысна адкрыць у газэце спэцыяльны аддзел па пытаньні чысткі, даючы адпаведныя назвы гэтым аддзелам, каб зацікавіць рабочых. Усе матар'ялы, прысланыя ў рэдакцыю аб чыстцы, калі яны заслугоўваюць увагі, павінны быць надрукаваны ў насьценгазэце.

Пры чыстцы надзвычайна важным момантам зьяўляецца ўдзел шырокіх рабочых і бядняцка-батрацкіх сераднякіх мас. Трэба дабіцца, каб масы ў найбольшых разьмерах скарысталі насьценгазэту, а для гэтага партыйныя арганізацыі і рэдакцыі насьценгазэт павінны правесьці растлумачальную працу сярод рабочых, сялян і рабселькораў. Толькі пры добрай падрыхтоўцы мы выканаем з посьпехам пастаўленую партыяй і ўладай задачу аб чыстцы партыі і апарату.

Гэты артыкул рэдакцыі павінны абгаварыць на сваім пасяджэньні і зрабіць практычныя вывады.

М. Л.

Перад чысткай савецкага апарату

Падрыхтоўваюцца новыя кадры працаўнікоў

Прэзыдыум ЦП саюзу саўгандальслужачых Беларусі на апошнім пасяджэньні заслухаў інфармацыю РСІ аб падыходзячай чыстцы савецкага і гандлёвага апарату.

Дакладчык тав. Жукаў адзначыў, што прафсаюзы павінны прымаць актыўны ўдзел у чыстцы. Прафарганізацыі павінны рашуча абараняць тых, працаўнікоў, якіх яны ведаюць, як людзей адданых савецкай уладзе. Антысавецкі элемент саюз ня толькі не павінен абараняць, а наадварот, ставіць пытаньне аб выключэньні з саюзу.

Чыстка будзе праведзена і на Біржы працы сярод беспрацоўных, гаўоўным чынам на сэкцыі разумовай працы.

Прэзыдыум ЦП вынес пастанову аб тым, каб папулярызаваць задачы чысткі сярод супрацоўнікоў устаноў.

У працягу красавіка ва многіх установах адбудуцца сходы на пытаньні чысткі. Уже адбыўся першы сход моладзі.

Для падрыхтоўкі зьмены вычышчаным арганізаваны курсы па пераквалі фікацыі працаўнікоў прылаўку, бухгальтарскія курсы, курсы сакратароў і дзелаводаў, машыністак, стэнаграфістак, рацыяналізатараў і статыстыкаў. Акрамя таго арганізаваны вытворчыя гурткі па банкаўскай справе, капірвучоце, па вывучэньні працоўнага заканадаўства і інш. Усяго на гэтых курсах і ў гурткох вучыцца каля 500 чал.

Па ЦРК намячаецца арганізаваць брыгаду на 100 чал. для падрыхтоўкі кваліфікаваных працаўнікоў прылаўку.

Працоўныя сьпісы ня ўсюды запоўнены

Па прапанове Наркампрацы, мясцовыя інспэкцыі працы правялі масавую праверку выкананьня пастановы ЦКК-РСІ аб запаўненьні працоўных сьпісаў на служачых. Абсьледваньне выявіла, што некаторыя ўстановы, асабліва ў раёнах, да гэтага часу ня выканалі гэтае пастановы.

Наркампрацы прапанаваў інспэкцыям працы прасачыць за тым, каб усе служачыя былі ахоплены працоўнымі сьпісамі і прыцягнуць да адказнасьці адміністратараў, ня выканаўшых пастановы НК РСІ.

13-га красавіка г. г. а 6-ай гадзіне ўвечары

ЦСПСБ СКЛІКАЕ

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКУЮ РАБОЧУЮ КАНФЭРЭНЦЫЮ

з наступным парадкам дня:

1. Аб падняцьці прадукцыйнасьці працы і працоўнай дысцыпліны (дакл. т. Карп і Розін).
2. Аб чыстцы савецкага апарату (дакл. т. Калініна або Рыскін)

Выбары дэлегатаў на паказаную канфэрэнцыю праводзяцца на агульных сходах рабочых.

Модус прадстаўніцтва 1 дэлегат на кожныя 20 рабочых выбаршчыкаў.

Выдача мандатаў будзе праводзіцца ў агульнай канцылярыі ЦСПСБ (Дом Працы, II-гі паверх) у наступныя дні:

У чацьвер 11 красавіка ад 5 да 7 г. увечары.
» пятніцу 12 » ад 12 г. дня да 7 г. увечары.
» суботу 13 » ад 9 г. раніцы да 3 г. дня ў агульнай канцылярыі ЦСПСБ, а з 4 г. дня да пачатку канфэрэнцыі ў памяшканьні канфэрэнцыі.

МЕНСК

Калі пачнецца пабудова Дому Ураду

Учора адбылося пасяджэньне ўродавай камісіі па пытаньні пабудовы дому ўраду. Камісія канчаткова намеціла месца пабудовы Дому. Дом ўраду будзе будавацца на вучастку па Савецкай вуліцы, пачынаючы з Нова-Маскоўскай вул. і канчаючы вуліцай Бэрэана. Будынак будзе мець 5 паверхаў у 130.000 кубічных мэтраў. У Доме Ураду будуць размешчаны ўсе наркаматы, ЦВК і СНК. Будзе абсталявана спэцыяльная заля для зьездаў саветаў і сэсій, клюбы для служачых, ліфты для ўздыму на верхнія паверхі і г. д.

Разгледжаны ўмовы конкурсу на складаньне праекту. За лепшыя праекты будуць выданы прэміі ад тысячы да 5 тысяч руб.

Афіцыяльная закладка Дому адбудзецца ў гадавіну аслабаненьня Беларусі ад белапалякаў—11 лютага, але фактычна будаўнічыя работы пачнуцца толькі ў жніўні месяцы. У бягучым будаўнічым сэзоне будзе закладзены фундамант і цакольны паверх будынку.

Арганізуецца цэнтральнае бюро абслугоўваньня

Пры Менскай пошце арганізуецца цэнтральнае бюро абслугоўваньня. Бюро будзе выдаваць даведкі па тэлефону аб нумарох тэлефонаў, адрасох гасьцініц, дактароў, даведкі па камунальных і жыльлёвых пытаньнях, літаратуры, аб раскладзе цягнікоў і г. д. Для гэтай мэты ў бюро будуць устаноўлены спэцыяльныя тэлефонныя апараты. Даведкі будуць платныя і дармовыя ў залежнасьці ад пытаньня.

У акругах намячаецца арганізаваць спрачныя сталы.

Арганізавана жыльлёвая камэра

З 1-га красавіка пры нарсудзе 3-га вучастку арганізавана камэра па жыльлёвых справах. У камэры будуць разглядацца канфлікты аб самачынным захопе кватэр, аб высяленьні з кватэр, пытаньні, зьвязаныя з кватэрнай платай.

За судзьдзю жыльлёвай камэры прызначаны нарсудзьдзя КАЗЛОЎ.

Адкрыцьце новых ясьляй

2-га мая адбудзецца ўрачыстае адкрыцьце ясьляй на 30 дзяцей пры шчотачнай фабрыцы. 6-га мая адкрываюцца ясьлі на 60 дзяцей на старажоўцы для рабочых харчовых заводаў.

Усебеларускі конкурс на лепшы савет

9.536 руб.—на прэміі па конкурсе

Цэнтральная конкурсная камісія пры прэзыдыуме ЦВК БССР вызначыла наступныя прэміі па ўсебеларускім конкурсе саветаў:

Для прэміяваньня сельскіх і местачковых саветаў—8 прэмій, з якіх: адна прэмія ў 800 рублёў (выдаецца сельска-гаспадарчымі машынамі), 2 прэміі па 600 рублёў (на кіно-пересоўкі), 2 прэміі па 400 рублёў (на радыё-ўстаноўкі) і 3 прэміі па 300 рублёў (на абсталяваньне саветаў).

Для прэміяваньня камісій сельскіх і местачковых саветаў—8 прэмій: 1 прэмія ў 400 рублёў, 3 прэміі па 250 рублёў і 4 прэміі па 200 рублёў. Прэміі выдаюцца рэчамі ў адпаведнасьці з тым, якая камісія будзе прэміявацца: санітарнай камісіі—цэмэнтавыя студні, сельска-гаспадарчай—машыны, культурнай—бібліятэка і інш.

Для прэміяваньня сэкцый гарсаветаў—8 прэмій: адна прэмія ў 800 рублёў, 2 прэміі—па 500 руб., 2 прэміі—па 400 руб. і 3 прэміі—па 300 руб. Прэміі выдаюцца таксама рэчамі.

Для прэміяваньня карэспандэнтаў за лепшыя конкурсныя допісы—24 прэміі: 2 прэміі—па 50 руб. (на гарнітур), 4 прэміі—па 25 руб. (на боты), 4 прэміі аблігацыямі пазыкі індустрыялізацыі па 25 руб., 6 прэмій—па 15 рублёў (гадзіньнікамі), 8 прэмій—па 12 рублёў (творы Леніна на беларускай мове).

Усяго, такім чынам, на прэміяваньне па конкурсе будзе выдана 9.536 руб.

За дзень

— КУРСЫ РАМОНТНЫХ РАБОЧЫХ. Пры Менскай паштова-тэлеграфнай канторы арганізуюцца двухтыднёвыя курсы па падвышэньні кваліфікацыі лінейных манцёраў і рамонтных рабочых.

— ДЗЕ БУДЗЕ ПАБУДАВАНЫ ПАШТАМТ. Вытворчая нарада з удзелам начальніка акругі сувязі тав. Бэргмана і прадстаўніка Наркампаштэлю прызнала найбольш выгадным месцам для пабудовы новага паштамту—рог вуліц Валадарскага і К. Маркса.

БАТРАКОЎ НА АДКАЗНУЮ РАБОТУ. Саюз сельгаспрацоўнікаў даў дырэктыву нізавым прафарганізацыям падрыхтаваць кандыдатуры сельгаспрацоўнікаў для занятьня адказных пасад ва ўстановах Па Менскай акрузе на адказную работу будзе вылучана 650 батракоў.

— ЯСЬЛІ І ДЗІЦЯЧЫЯ ПЛЯЦОЎКІ Ў САЎГАСАХ. Па дагаворы з народным камісарыятам аховы здароўя ў гэтым годзе ў саўгасах Беларусі будзе арганізавана 35 ясьляй і 15 дзіцячых пляцовак. У Менскай акрузе будзе арганізавана 14 ясьляй і 5 пляцовак.

„Тыдзень“ барацьбы за чыстату

Напярэдадні першамайскага сьвята ў Менску будзе праведзены «Тыдзень» барацьбы за чыстату. Да гэтай справы прыцягваецца санітарны актыў ЖАКТаў. Па ЖАКТах будзе праведзены рад сходаў хатніх гаспадынь.

Студэнцкія арганізацыі вылучаюць каля 200 студэнтаў для генэральнага абсьледваньня ўсіх дамаўладаньняў, гасьцініц, харчовых прадпрыемстваў і сталовак. Будзе прачытана некалькі лекцый па санітары і гігіене на прадпрыемствах і ў рабочых клюбах.

Вечар яўрэйскай этнаграфіі

Каб папулярызаваць краязнаўчы рух сярод шырокіх яўрэйскіх мас, студэнцкае таварыства краязнаўства пры БДУ II-га красавіка наладжвае вялікі вечар яўрэйскай этнаграфіі. На вечары будуць выкананы лепшыя мастацкія народныя творы: песьні, казкі, скокі і інш. У вечары прымаюць удзел мастацкія яўрэйскія сілы Менску. На вечар запрашаюцца рабочыя буйнейшых фабрык і заводаў. Вечар адбудзецца ў клюбе К. Маркса.

Зьезды і канфэрэнцыі

Усебеларуская канфэрэнцыя інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў

Пасьля справаздачы тав. Каплана аб дзейнасьці міжсэкцыйнага бюро інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў канфэрэнцыя заслухала даклад тав. Гольдштэйна аб эканамічнай рабоце ІТС.

За апошні час інжынэрна-тэхнічныя сэкцыі распрацавалі некалькі пытаньняў, зьвязаных з 5-гадовым перспэктыўным плянам, а таксама прамфінплянам на 1928-29 год. Асаблівая ўвага была ўдзелена пытаньням новага будаўніцтва.

Павялічыўся ўдзел ІТС у вытворчых і эканомкамісіях. На радзе прадпрыемстваў—завод «Чырвоная Зорка», Эльвод «Энэргія» і г. д.—інжынэрна-тэхнічныя працаўнікі зьяўляюцца старшынямі, або сакратарамі вытворчых і эканамічных камісій.

Дакладчык ставіць перад ІТС на бліжэйшы час наступныя задачы:

Інжынэрна-тэхнічныя працаўнікі павінны прыняць актыўны ўдзел у канчатковай прапрацоўцы пацігодні, разглядзець ўсе без выключэньня галоўнейшыя праекты новага будаўніцтва.

Інжынэрна-тэхнічныя працаўнікі с.-г. вытворчасьці павінны ўдзельнічаць у мерапрыемствах па падняцьці ўраджайнасьці.

Учора зранку пачаліся спрэчкі па дакладу тав. Гольдштэйна.

Закрыўся ўсебеларускі зьезд камунальнікаў

На апошнім пасяджэньні ўсебеларускага зьезду саюзу камунальнікаў абгаварваўся даклад тав. ШКУРДЗЕ аб станоўішчы камунальнай гаспадаркі БССР і даклад інспэктара НК РСІ тав. ЛІЎШЫЦА аб выніках абсьледваньня камунальнай гаспадаркі па акругах.

Дэлегаты, якія выступалі ў спрэчках, паказвалі на рад недахопаў у рабоце камгасаў.

— Часта камунальныя органы захапляюцца новым будаўніцтвам і не ўдзяляюць увагі адчаўленьню і рамонту існуючых будынкаў. Па Менску ёсьць каля 250 камунальных дамоў, якія не рамонтуюцца. Ніхто на хочэ іх брацьць у арэнду. Няма выстарчальнага тэхнічнага нагляду за забраванымі вуліцамі.

Зьезд вынес рад канкрэтных рашэньняў па пытаньні аб палепшаньні камунальнай гаспадаркі і пажарнай аховы.

Зьезд выказаўся за аб'яднаньне камунальнай і прамысловай пажарнай аховы ў адзінае кіраўніцтва пры НКУС.

8-га красавіка зьезд закрыўся. Пасланы прывітальныя тэлеграмы ЦК КП(б)Б, ЦК саюзу камунальнікаў і ЦСПСБ.

Усебеларуская нарада па ахове здароўя

8-га красавіка ў Менску адкрылася ўсебеларуская нарада акруговых інспэктароў па ахове здароўя. На нарадзе будзе абгаварвацца пацігодна па ахове здароўя ў Беларусі, а таксама вырашаны рад іншых пытаньняў.

На літаратурным дыспуце

8 красавіка ў памяшканьні Беларускага Дзяржаўнага Тэатру адбыўся дыспут на тэму «Агляд і шляхі беларускай літаратуры».

З уступнай прамовай выступіў т. ШАСТАКОЎ.

На працягу паўтары гадзін дакладчык спынаўся на марксыцкай тэорыі мастацтва, на разьвіцьці наогул літаратуры і г. д., але аб беларускай літаратуры гаварыў вельмі мала.

Вялікая аўдыторыя прысутных чакала, што дакладчык канкрэтна спыніцца на беларускіх літаратурных плынях, завострыць увагу пісьменьнікаў і грамадзянскасьці на стане сучаснай беларускай літаратуры, на творах, якія адбіваюць незабуржазную ідэалёгію, на тэй барацьбе, якая адбывалася на культурным фронце. Але, на жаль, дакладчык гэтага не зрабіў.

У спрэчках выступіла 9 чалавек. Ул. ДУБОЎКА, Ф. КУПЦЭВІЧ, і КРАПІВА («Узвышша») у сваіх выступленьнях абхадзілі цэлы рад буйных пытаньняў сучаснага літаратурнага жыцьця і сканцэнтравалі сваю ўвагу на пытаньні нягоднасьці і шкоднасьці для разьвіцьця літаратуры напісьменных выступленьняў крытыкаў накшталт Т. ГЛЫБОЦКАГА, М. БАЙКОВА. Дубоўка выступіў з растлумачэньнем сваёй паэмы «І пурпуровых ветразэй узьвівы», гаварыў супроць крытыкаў Ч—ч і Нэдэ. Дубоўка даводзіў, што вібы яго паэму направільна зразумелі.

АЛЯХНОВІЧ зазначаў, што БелАПП замоўчваецца некаторымі крытыкамі.

Выступіўшы БЭНДЭ адказваў Дубоўцы, адзначаў хібы «Полымя», БелАПП'у і інш. Працяг дыспуту сёньня.

Як трэба рэарганізаваць эканамічнае аддзяленьне БДУ

(У парадку абгаварэньня)

Зараз праводзіцца рэарганізацыя эканамічнага аддзяленьня БДУ і перагляд яго навучальнага пляну. У нанава распрацаваным пляне ёсьць шмат такіх прадметаў, якія патрэбны студэнту ў яго па заўніверсытэцкай рабоце, ня ў першую, а ў апошнюю чаргу. Да такіх прадметаў па эканамічным аддзяленьні трэба аднесьці хэмію, фізіку і іншыя дысцыпліны. Яны патрэбны толькі для некаторай зусім нязначнай часткі студэнтаў, якія думаюць вучыцца на адміністрацыйна-прамысловым цыклі, між тым гэтыя дысцыпліны абавязковы для ўсіх студэнтаў эканамічнага аддзяленьня. Нам здаецца, што навучальны плян павінен быць складзены так, каб ён даваў максымум таго, што зьяўляецца абавязковым і патрэбным, і мінімум таго, што вымагаецца ў другую чаргу.

Цяпер некалькі слоў наконт таго, калі і ў якім парадку навучальны плян будзе праходзіцца на курсах. Паводле новага пляну студэнты на эканамічным аддзяленьні сустракаюцца з прадметамі па сваёй спэцыяльнасьці толькі на апошнім, альбо ў лепшым выпадку на перадапошнім курсе. Па першым-жа і на другім курсах праходзяцца толькі такія дысцыпліны, якія нічога агульнага ня маюць з будучаю спэцыяльнасьцю студэнта.

Дзякуючы такой пастаноўцы працы, вельмі часта нашы дзяржаўныя, каапэрацыйныя і гаспадарчыя ўстановы альбо зусім адмаўляюцца прымаць практыкантаў-студэнтаў, якія накіроўваюцца на вытворчую практыку, альбо даюць ім нумараваць і прашнуроўваць справы і падшываць паперы.

Такі студэнт, паступіўшы на праўгас непасрэдна ад варштату, альбо ад сахі, на працягу двух год вывучаў гісторыю народнае гаспадаркі, гісторыю права, хэмію, фізіку і інш., а зусім ня чуў пра тое, што такое справаводзтва, крэдыт, ашчадная справа, якіх відаў бывае каапэрацыя і інш.

Само сабою зразумела, што мы зусім ня думаем выкідваць з навучальнага пляну вышэйшых навучальных устаноў агульна-адукацыйных дысцыплін.

Ад скончыўшых наш універсытэт мы павінны патрабаваць ня толькі вузкай спэцыяльнай кваліфікацыі ў тэй ці іншай галіне эканамічнай навукі, але мы павінны патрабаваць і агульнага пашырэньня яго сьветапогляду.

Аднак, гэта зусім ня значыць, што мы павінны будаваць нашы навучальныя праграмы такім чынам, каб даць студэнту ў першую чаргу тыя веды, якія яму патрэбны ў апошнюю, а веды, з якімі ён непасрэдна сустрэнецца па сканчэньні універсытэту, даваць яму потым.

Канкрэтна я стаўлю пытаньне так: трэба праграму 1-га і 2-га курсаў амаль што поўнасьцю зрабіць праграмаю 3-га і 4-га курсаў, а праграму 3-га і 4-га курсаў праходзіць у першы і другі год навучаньня ва універсытэце. Такая перабудова навучальных плянаў на эканамічным аддзяленьні дасьць магчымасьць студэнтам прыстасоўваць набытыя веды ў іх практычнай працы па сканчэньні універсытэту.

Рабцэвіч.

Адсутнічае нагляд за работай хатніх работніц

Хатнія работніцы працуюць у вельмі дрэнных умовах

Наркампрацы зрабіў абсьледваньне ўмоў працы хатніх работніц па 5-ці акругах БССР. Абсьледваньне выявіла, што работніцы, у большасьці сваёй, эксплёатуюцца. Ёсьць выпадкі, калі на работу прымаюцца няпоўнагадовыя, на якіх, ня гледзячы на забарону, акруговыя аддзелы саюзу Нархарч заключаюць дагавары. У большасьці выпадкаў работніцы працуюць па 10-12 гадзін, пры чым перапрацаваны час ім нідзе не аплачваецца.

Абсьледваньне паказала, што хатнія работніцы зусім ня маюць водпуску, выхадныя дні прадастаўляюцца нерэгулярна, а па жаданьні гаспадароў.

Работніцам па многіх мясцох не дазваляюць ісьці на заняткі ў вячэрнія школы, на сходы і г. д.

Цэнтральнае праўленьне саюзу Нархарч прапанавала зьвярнуць увагу на выніку абсьледваньня і дабіцца палепшаньня ўмоў жыцьця хатніх работніц.

Беларускае настаўніцтва ў Латвіі дзякуе „Чырвоны Крыж“

За дапамогу бяднейшым вучням

Цэнтральны камітэт Беларускага таварыства «Чырвоны Крыж» атрымаў з Латвіі ад саюзу настаўнікаў беларускіх школ падзяку за кнігі і падручнікі, якія паслаў «Чырвоны Крыж» беларускім школам у Латвіі.

Саюз настаўнікаў Латвіі адзначае, што дапамога «Чырвонага Крыжу» дала магчымасьць бяднейшым вучням беларускіх школ—дзецям рабочых і сялян—вучыцца на іх роднай мове.

Згодна пастановы праўленьня саюзу ўся літаратура, прысланая Беларускім «Чырвоным Крыжам» (на суму звыш 3 тыс. рублёў) разьмеркавана паміж школьнымі бібліятэкамі ў Рызе і Латгаліі.

Такую-ж падзяку «Чырвоны Крыж» атрымаў і ад школьнага савету і бацькаўскага камітэту беларускай пачатковай школы ў Дзьвінску.

СПОРТ

Ранішняя гімнастыка на прадпрыемствах

Прэзыдыум ВСФК склікае ў канцы красавіка, разам з ЦСПСБ шырокую нараду па пытаньні аб увядзеньні ранішняй гімнастыкі на прадпрыемствах г. Менску. У нарадзе прымуць удзел прадстаўнікі гаспадарчых арганізацый, прафсаюзаў, камсамол і фізкультурны актыў.

Падрыхтоўка да сялянскай спартакіяды

Зацьверджаны склад арганізацыйнага камітэту па падрыхтоўцы ўсебеларускай сялянскай спартакіяды. У склад камітэту ўвайшлі прадстаўнікі ЦСПСБ, Наркамасьветы Асоавіяхіму, ЦП саюзу праземлес і інш. Спартакіяда адбудзецца ў жніўні ў Менску. У праграме спартакіяды—лёгкая гімнастыка і гульні. У спартакіядзе прымуць удзел 200 фізкультурнікаў з сялянскае моладзі, па 25 чал. з кожнае акругі.

15-га мая пачнецца торфарасправоўкі

Белторф атрымаў новых машын, якія будуць накіраваны на торфарасправоўкі Бабруйску і Барысаву. Новыя машыны даюць магчымасьць значна павялічыць здабываньне торфу. Сэзон торфарасправок пачнецца не пазьней 15-га мая, пры чым на работах будзе занята звыш 1.000 чал.

Кнігі для рэцэнзіі

Рэдакцыяй «Зьвязды» атрыманы для рэцэнзіі наступныя кнігі:

М. БАЙКОЎ — МІКОЛА КРЫВІЧ, — зборнік крытычных артыкулаў «На літаратурныя тэмы».

КУЗЬМА ЧОРНЫ.—«Верасьнёвыя ночы», кніжка апавяданьняў.

АЛЕСЬ САЛАГУБ,—«Лукішкі», вершы з Заходняй Беларусі.

А. АЛЕКСАНДРОВІЧ,—«Фабрыка сьмерці», вершы.

«НАШ КРАЙ».—Часопісь краязнаўства № 2.

«САВЕЦКАЕ БУДАЎНІЦВА»,—часопісь палітыкі і эканомікі № 1.

П. ЗАБЛОЦКІ,—«Асновы сельскае гаспадаркі».

Л. РЫБАКОЎ,—«Кантрактацыя»,—выпуск сялянскае бібліятэкі.

М. ПЕРАФЯРКОВІЧ,—«Што загатаўляць для продажу заграніцу», выпуск сялянскае бібліятэкі.

«ЛІСІЦА—ХІТРЫЦА», бібліятэка маладога прыродазнаўцы.

А. ОРШЫН.—«Дзікія роды»,—апавесьць.

Паведамленьне

— 10 красавіка, а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканьні АПО габінэту адбудзецца нарада прапагандыстых адзінай партшколы Фрунзаўскага раёну.

Просьба зьявіцца без спазьненьня.

АПО ФРУНЗАЎСКАГА РК КП(б)Б.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА

На 1 год—9 руб. 75 кап., на 6 мес.—5 руб., на 3 мес.—2 руб. 60 кап., на 1 мес.—90 кап. Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газэты «Зьвязда»—Менск, Савецкая, 63 (трэці паверх), ад 9 гадз. раніцы да 5 гадз. дня. У правінцыі—упоўнаваж. гал. к-ры, адда. Б.Д.В. і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.

ПАДПІШЫСЯ НА ГАЗЕТУ „ЗЬВЯЗДА“

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонпарэлі (пасьля тэксту)—50 кап., іншагароднія—1 руб., пасярод тэксту ў два разьцяражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка па згодзе. Згодна паст. СНК ад 10-IX—1924 г. бярэцца зьверх тарыфу 10 проц. падатку.

ТЭАТР. КІНО

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
КАР'ЕРА „таварыша“ Брызгаліна
Серада, 10 красавіка
Для ЛКСМ
ПАЧАТАК а 8-й гадзіне ўвеч.

ГЭТЫМІ ДНЯМІ!
БЕЛДЗЯРЖКІНО выпускае ў пракат кіно-фільму Ўласнай вытворчасьці
ПЕСЬНЯ ВЯСНЫ
ПА АПОВЕСЬЦІ народнага паэты БССР Якуба Коласа „На прасторах жыцьця“
ГЭТЫМІ ДНЯМІ!

Кіно-тэатр КУЛЬТУРА
Гордасьць украінскай кінематаграфіі АРСЕНАЛ
Сцэнары і пастаноўка А. ДОЎЖАНКА.

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ
Сусьветны комік ГАРОЛЬД ЛЁЙД у лепшай трукавай камедыі УНУЧАК БАБКІ
Пачатак 1-га сеансу ў 6 г. 30 м. Каса з 5 г.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ
СЛАВУТЫ кіно-артыст КОНРАД ВЭЙДТ у грандыёзнай мастацкай пастаноўцы СКРЫПАЧ З ФЛЕРЭНЦЫІ
Мастацкая драма ў 7 част.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр ЮНЫ ПІЯНЭР (памяшканьне кіно „ПРАЛЕТАРЫ“)
ВАСЯ РЭФАРМАТАР
Арыгінальная камедыя ў 6 част.
Пачатак а 3 гадз. дня. Каса—ад 2 гадз. Цана білета 10 кап. Месны прадумаран.

КІНО СПАРТАК
З прычыны вялікага посьпеху яшчэ 3 дні—9, 10, 1 11 красавіка
ТРЫПОЛЬСКАЯ АГАЗДЫЯ
Драма ў 7 част.

ВСЕ для СПОРТА и ОХОТЫ!

БЕЛОРУССКОЕ ПРОЛЕТАРСКОЕ СПОРТИВНОЕ О-ВО „ДИНАМО“
К ПРЕДСТОЯЩЕМУ ВЕСЕННЕМУ СЕЗОНУ ПРЕДЛАГАЕТ
ВСЕВОЗМОЖНЫЙ СПОРТИВНЫЙ, ОХОТНИЧИЙ И СТРЕЛКОВЫЙ ИНВЕНТАРЬ
как советского, так и заграничного производства
ИМЕЕТСЯ БОЛЬШОЙ ВЫБОР всевозможных, как мелкокалиберных, так и боевых ПАТРОНОВ
Иногородние заказы выполняются наложенным платежом при получении задатка в размере 25%.
Адрес правления, магазина и склада: г. Минск, Советская 58, тел. 11-36
Ком. отд. БПСО «ДИНАМО»

ПАДРУЧНІКІ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ, ВЫДАНЫЯ Ў 1929 Г.
Вайтэнка В. Т.
1. Агульнае рахункаводзтва — Пасобнік для ВНУ, прам.-экан. тэхн. бухг. курсаў і спэц. клясаў.
2. Практычная тэма агульнага рахункаводзтва — З поўнымі рашэньнямі і тлумачэньнямі па двайной сыстэме. Паказанымі пасобнікамі можна карыстацца і для самавучаньня. Набыць можна на бухгальтарскіх курсах . . . . . .
3. Камэрцыйныя вылічэньні — Пасобнік для ВНУ, прам. экан. тэхн. бухг. курсаў і спэц. клясаў.
4. АСНОВЫ СТАТЫСТЫКІ

Згубленыя і ўкрадзеныя дакуманты лічыць несапраўднымі:
Пасьведчаньне Глінскай А. М., выд. Меп акрсабезам. 1445
Пашпарт Дабачэўскай А. І., выд. Менскай міліцыяй. 1446
Вайсковая кніжка Пратаповіча А. С., выд. Заслаўск. РВК. 1447
Пашпарт Файвышовіч Э. Е., выд. Менск. міліцыяй. 1448
Каапэрац. кніжка № 2900 Тыдоцкай Г., выд. Менск. прыгарод. спажыв. т-вам „Земляроб“. 1449
Біржавая картка Раскіна С. Г., выд. Менск. біржай працы. 1450
Пашпарт № 079779, выд., Маскоўскай міліцыяй, вайсковая кніжка № 2935, выд, Маскоўскім ваенкаматам. і членскі білет № 39535 саюзу будаўнікоў на імя Ілюшкіна І. Г. 1451—1453
Асабовая кніжка № 69 Шубара А. С., выд., Барысаўскім ваенкаматам. 1454
Членская кніжка саюзу мясцовых працы Гольдберг А. Г. 1455
Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2-ое гадзіны дня

У ВЫПАДУ НЕАКУРАТНАЙ дастаўкі газэты „ЗЬВЯЗДА“ званеце па тэл. 2-49

Кошт публікацыі 50 кап. аб згубе дакумэнту

ФОТО-ЦЫНКАГРАФІЯ ПРЫМАЕ ЗАКАЗЫ НА КЛІШЭ
ШТРЫХОВЫЯ ТОНАВЫЯ СЕТКА
МАСТАЦКАЕ ВЫКАНАНЬНЕ РЭСУНКАЎ
З ЗАКАЗАМІ ЗВАРОЧВАЦЦА Ў ГАЛОЎНУЮ КАНТОРУ ГАЗЭТЫ „ЗЬВЯЗДА“-МЕНСК, САВЕЦКАЯ, №63, 3-ці ПАВЕРХ
ПАРТРЭТЫ, ГРАВЮРЫ, ПЛЯНЫ, СХЭМЫ, ФАКСІМІЛЕ, ЭТЫКЭТЫ, ЦЭНЬНІКІ, ВОКЛАДКІ, ВІНЬЕТКІ, РЭКЛЯМНЫЯ ПЛЯКАТЫ І ІНШЫЯ МАСТАЦКІЯ РАБОТЫ.

Менск Галоўлітбел № 698.

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск